## Беларусь і Еўрасаюз у бліжэйшым будучым вырашаць праблемы ў сваіх узаемаадносінах

**Беларусь і Еўрасаюз у бліжэйшым будучым вырашаць праблемы, якія існуюць у іх узаемаадносінах. Упэўненасць у гэтым выказаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 20 снежня ў інтэрв'ю тэлеканалу Euronews.**

У час інтэрв'ю размова ішла аб праведзеных у Беларусі прэзідэнцкіх выбарах, а таксама аб узаемаадносінах Беларусі з ЕС і Расіяй. Кіраўнік дзяржавы, адказваючы на пытанне аб ацэнцы міжнароднымі назіральнікамі прэзідэнцкіх выбараў, падкрэсліў: «Гэта вялікі крок наперад у параўнанні з 2006 годам. І на гэтай базе мы можам выбудоўваць свае адносіны з Еўропай». Пры гэтым Прэзідэнт адзначыў: «Той, хто хоча сапраўды непрадузята бачыць абстаноўку ў Беларусі, той яе такой і бачыць». Аляксандр Лукашэнка сказаў, што ў Беларусі і ЕС нямала праблем, але яны павінны быць вырашаны ў бліжэйшай будучыні: «Усё гэта пройдзе, гэта — наноснае. Я ад вас прашу адзінага — аб'ектыўнасці, якой пакуль малавата ў інфармацыі па Беларусі».

## АЛЯКСАНДРА ЛУКАШЭНКУ ПАВІНШАВАЛІ...

### Працоўныя калектывы і арганізацыі Беларусі

У адрас Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі працягваюць паступаць сотні віншаванняў ад працоўных калектываў, навучальных устаноў, прадпрыемстваў і іншых арганізацый краіны.

### Прэзідэнт Азербайджана

Прэзідэнт Азербайджана Ільхам Аліеў павіншаваў свайго беларускага калегу Аляксандра Лукашэнку з перамогай на прэзідэнцкіх выбарах. Як адзначаецца ў пасланні Ільхама Аліева, размешчаным на афіцыйным сайце кіраўніка азербайджанскай дзяржавы, Беларусь і Азербайджан спакон веку звязаны цеснымі вузамі дружбы і супрацоўніцтва. «Упэўнены, што нашы міждзяржаўныя адносіны, грунтуючыся на гэтых добрых традыцыях, і ў далейшым будуць развівацца і ўмацоўвацца ў імя працвітання нашых народаў, у імя міру, стабільнасці і прагрэсу ў рэгіёне», — гаворыцца ў пасланні Прэзідэнта Азербайджана. «Жадаю вам, паважаны Аляксандр Рыгоравіч, моцнага здароўя, шчасця і поспехаў у вашай дзяржаўнай дзейнасці», — сказана ў віншаванні.

### Прэзідэнт Ірана

Прэзідэнт Ірана Махмуд Ахмадзінежад адправіў пасланне ў адрас Аляксандра Лукашэнкі, у якім павіншаваў яго з перамогай на прэзідэнцкіх выбарах. Аб гэтым паведаміў іранскі тэлеканал «Прэс-ТБ». «Гэтыя выбары сталі яшчэ адной залатой старонкай у бліскучай гісторыі беларускага народа», — адзначаецца ў пасланні. На думку іранскага лідара, вынікі галасавання паказалі, што грамадзяне Беларусі падтрымліваюць Аляксандра Лукашэнку. Прэзідэнт Ірана таксама выказаў надзею на тое, што супрацоўніцтва паміж Тэгеранам і Мінскам будзе ў далейшым умацоўвацца.

### Прэзідэнт Туркменістана

Прэзідэнт Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедаў павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з пераабраннем яго на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Гурбангулы Бердымухамедаў выказаў упэўненасць, што традыцыйна дружалюбныя адносіны паміж нашымі краінамі і народамі, а таксама ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва будуць няўхільна развівацца.

### Прэзідэнт Таджыкістана

Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку ўчора пазваніў Прэзідэнт Таджыкістана Эмамалі Рахмон, які павіншаваў кіраўніка беларускай дзяржавы з пераканаўчай перамогай на выбарах і пажадаў далейшых поспехаў. У ходзе размовы таксама былі абмеркаваны пытанні двухбаковага супрацоўніцтва, у тым ліку ў сферы пашырэння прамысловай кааперацыі і ўдзелу беларускага боку ў будаўніцтве і мадэрнізацыі таджыкістанскіх прадпрыемстваў па выпрацоўцы гідраэлектраэнергіі.

### Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Грузіі

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Грузіі Міхаіла Саакашвілі з днём нараджэння.**

«Перакананы, што двухбаковае супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Грузіяй, заснаванае на прынцыпах узаемапавагі і партнёрства, будзе і далей няўхільна развівацца», — гаворыцца ў віншаванні.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# «КОЛЬКІ НІ КУПЛЯЎ, НІ РАЗУ НЕ ВЫЙГРАЎ!»

Парламенцкі дзённік

## Дэпутаты ад імя выбаршчыкаў скардзяцца на некаторыя віды рэкламы

Адкрываючы чарговае пасяджэнне сесіі, **старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** заявіў, што прэзідэнцкія выбары ў Беларусі прайшлі ў адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам і міжнароднымі стандартамі. Сумленна, адкрыта і дэмакратычна. Перамогу Аляксандра Лукашэнкі ён назваў пераканаўчай. Спікер таксама лічыць яе агульнай, паколькі гэта перамога курса, які падтрымліваецца большасцю грамадзян Беларусі. Вынікі выбараў сведчаць, паводле яго слоў, і пра ўхваленне рашэнняў IV Усебеларускага сходу, скіраваных на далейшае будаўніцтва моцнай і квітнеючай Беларусі.

Тут жа на сесіі дэпутаты і зрабілі ўнёсак у далейшы эканамічны росквіт краіны, ратыфікаваўшы шэраг пагадненняў у рамках Мытнага саюза. На вячэрнім пасяджэнні яны разгледзелі пагадненні па фарміраванні адзінай эканамічнай прасторы. З тым, каб беларускі бок мог завяршыць усе неабходныя ўнутрыдзяржаўныя працэдуры да пачатку года.

Дбайныя ахоўнікі інтарэсаў сваіх выбаршчыкаў, дэпутаты назбіралі шмат іх скаргаў на... рэкламу. І усё як на споведзі выклалі **міністру гандлю Валянціну ЧАКАНАВУ**, скарыстаўшыся магчымасцю пры разглядзе новых паправак у закон аб рэкламе. Іх, да слова, народныя выбраннікі падтрымалі ў першым чытанні. Што, тым не менш, не змякчыла іх праведнага гнеў ад імя выбаршчыкаў да асобных відаў рэкламы.

Засіллем лятарэйнай рэкламы незадаволеныя дэпутаты Генадзь Давыдзька і Аляксандр Юшкевіч. Няхай і па розных нагодах. «Колькі білетаў ні купляў, ні разу не выйграў», — упікае першы. «Нібыта можна не вучыцца і не працаваць, купляй сабе латарэйку — і ўсё ў цябе атрымаецца. Машына, кватэра, тэлевізары, лядоўні будуць», — даводзіць другі.

Абодва парламентарыі таксама звярнулі ўвагу прафільнага міністэрства на дэманстрацыю тэлерэкламы. Аляксандр Юшкевіч заўважыў, што відэарэклама ва ўсім свеце з'яўляецца мастацтвам, ладзяцца адмысловыя фестывалі. Ролікі цікавыя, «глядзіш — і адчуваеш, што гэта зроблена таленавітым чалавекам». У той час як наша рэклама «смахвае на нейкую халтуру».

Генадзь Давыдзька перадаў абурэнні гледачоў наконт гуку і працягласці рэкламных ролікаў. Новыя папраўкі ў закон, дарэчы, прадугледжваюць, што гук рэкламы павінен быць не толькі не гучнейшы за сярэдні ўзровень гуку асноўнага вяшчання, але і на адзін паказчык цішэйшы. Валянцін Чаканаў запэўніў парламентарыя, што «сёння ўжо няма той сітуацыі, як тры гады таму», калі рэклама магла займаць 30 хвілін з гадзіны. Міністэрства гандлю трымае сітуацыю на кантролі — рэгулярным маніторынгам, які заканчваецца для некаторых тэлеканалаў штрафам ад 20 да 50 базавых. Правяраецца і працягласць, і гучнасць — у цэлым выкананне патрабаванняў заканадаўства.

Занадта жорсткая пазіцыя некаторых дэпутатаў у дачыненні да іх не сустрэла асабліва энтузіязму ў кіраўніка Міністэрства гандлю. Дэпутат Давыдзька, напрыклад, прапанаваў наогул забараніць рэкламу піва. Аднак міністр яму запярэчыў, спасылаючыся на новыя эканамічныя ўмовы, у прыватнасці, у сувязі з фарміраваннем Мытнага саюза:

— Мяркую, забараняць нельга. Нашы вытворцы сёння павінны сябе рэкламаваць.

Але ж ад дэпутацкага вока не схаваецца і... схаваная рэклама піва. Прынамсі так расцэньвае наяўнасць бутэлькі ў руцэ мінака дэпутат Уладзімір Здановіч. Таму прапануе транспартаваць яго выключна ў закрытых непразрыстых пакетах. Міністр гандлю нагадаў, што з 23 лютага ў Беларусі забаронена піць піва ў грамадскіх месцах. А каб яшчэ і пераносіць у непразрыстых пакетах... Ён згадаў, што такі вопыт ёсць у ЗША. А вось ці варта скарыстацца ім нам? «Над гэтым трэба падумаць», — рэзюмаваў міністр. Тым часам у інтэрнэце ніякіх перашкод нават вытворцам алкагольных напояў новы законапраект не чыніць. Папраўкі дазваляюць вытворцам размяшчаць рэкламу такой прадукцыі на сваіх сайтах.

Ёсць і такія тавары ці паслугі, рэклама якіх выклікае ў парламентарыяў паболей трывогі, чым піва. І тое, што змушае іх непакоіцца насапраўднаму, — казіно.

— Ва ўсім свеце хочуць пазбавіцца, а ў нас рэкламуюць, — бянтэжыцца **дэпутат Ларыса ВЕРШАЛОВІЧ**.

Як доктар яна занепакоеная яшчэ і з'яўленнем праблем з гульнявой залежнасцю ў перспектыве. Маўляў, нават з наркатычнай залежнасцю цяпер змагаюцца, а вось гульнявую яшчэ ніхто не вылечваў. Міністр падкрэсліў, што пытанне патрабуе дадатковага вывучэння, аднак заўважыў, што гэты від дзейнасці афіцыйна дазволены ў Беларусі. Маўляў, чаму б яму не рэкламавацца...

А незадаволеным так званым паштовым спамам — хто яшчэ не вымаў са сваёй скрыні гару рэкламных лістовак?! — заканадаўцы прапануюць «засланку» ад яго. Па пісьмовай заяве адрасата аператар паштовай сувязі (з толькі ім будзе дазволена разносіць рэкламныя матэрыялы) абавязаны будзе спыніць дастаўку яму рэкламы. Дадуць «інструмент» і для змагання з тэлефонным спамам: аператарам сотавай сувязі абавязкова ўносіць у дагавор асаблівую адзнаку, якая інфармуе грамадзян пра іх права адмовіцца ад атрымання рэкламы ці патрабаваць яе неадкладнага спынення.

Новаўвядзенні і ў вонкавай рэкламе. Спрошчаецца працэдура ўзгаднення вонкавай рэкламы і павышэння магчымасці яе размяшчэння. Білборды з'явяцца ўздоўж дарог. Пры гэтым, праўда, заканадаўча замацоўваецца недапушчальнасць рэкламы на дарозе і над ёю.

Заканадаўцы плануюць вывесці на чыстую ваду банкі: каб пісалі ў рэкламе не толькі памеры працэнтных ставак па крэдытах і ўкладах, але і пра камісію, якую бяруць за карыстанне крэдытам, напрыклад. Ці пра магчымасць змянення працэнтаў па ўкладах, калі такі нюанс ёсць у дамове, зразумела. У цэлым, папраўкі скіраваны найперш на спажыўца, як бачым. Прадпрымальнікам зрабілі палёгку хіба толькі ў тым, што пазбавілі ад лішняга бюракратычнага грузу пры размяшчэнні вонкавай рэкламы. А яшчэ знялі абмежаванне на частату пракруткі тэлерэкламы (раней можна было рэкламавацца не часцей за два разы на працягу адной эфірнай гадзіны). Што ж, пабачым, як успрымуць новаўвядзенні ўсе зацікаўленыя бакі...

**Зоя ВАРАНЦОВА.**



Фота БЕЛТА.

## Калядны кірмаш у Каробчыцах

**З традыцыямі калядавання ў беларускіх вёсках можна азнаёміцца ў агратурыстычным комплексе «Гарадзенскі маёнтак «Каробчыцы». У суботу там адкрыўся калядны кірмаш, які, з перапынкамі, будзе доўжыцца да восьмага студзеня.**

Гаспадары маёнтка (Гродзенскі мясакамбінат) арганізавалі цікавую забаўляльную праграму з конкурсамі і спевамі ля «Каляднай батлейкі», створанай рэзчыкамі па дрэве падчас міжнароднага пленэра. Акрамя таго, на кірмашы працуе «Пошта Дзеда Мароза». Усе пісьмы, скрыню з якімі возіць па маёнтку поні на маленькім дыліжансе, будуць дастаўлены ў рэзідэнцыю галоўнага беларускага Дзеда Мароза ў Белавежскай пушчы. І, зразумела, шматлікіх гасцей частавалі разнастайнымі стравамі, у тым ліку гарачымі блінамі з мёдам, збіценямі, юшкай, глінтвейнам. Пры гэтым не ставілася мэта атрымання максімальнага даходу: вырабы мясакамбіната прадаваліся з 50-працэнтнай зніжкай ад гандлёвай нацэнкі, а грошы ад рэалізацыі ўваходных білетаў пойдуць у фонд будаўніцтва Гродзенскага спецыялізаванага Дома дзіцяці.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## Абзац

◢ Жыхар Вілейкі захапіў таксі. Справа аб разбоі распачатая ў Вілейскім РАУС у дачыненні да 26-гадовага жыхара райцэнтра. Мужчына падазраецца ў тым, што 19 снежня здзейсніў разбойны напад на кіроўцу таксі, які падвозіў яго, і захапіў машыну. Нападнік накінуў кіроўцу на шыю вяроўку, аднак таму ўдалося выскачыць з машыны. Зламыснік, які знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення, з'ехаў у невядомым кірунку. Для вышуку машыны і згоншчыка на тэрыторыі раёна ўводзіўся план «Перахоп». Аўтамабіль быў знойдзены, падазроны — затрыманы.

**◢ Грамадзянін Літвы спрабаваў перавезці наркотыкі праз беларускую мяжу. У пункце пропуску «Каменны Лог» смаргонскія памежнікі сумесна з супрацоўнікамі дзяржбяспекі і мытных органаў затрымалі аўтамабіль Mercedes пад кіраваннем грамадзяніна Літвы. Падчас вобыску ў машыне было выяўлена 8 пакетаў па 300 г, кожны з рэчывам расліннага паходжання, як мяркуецца, марыхуанай. Заведзена справа, праводзіцца разбор.**

◢ Штодзённае нанясенне макіяжу можа выратаваць жыццё, лічаць французскія навукоўцы. На іх думку, рытуал нанясення касметыкі адыгрывае ролю комплексу практыкаванняў, якія паляпшаюць каардынацыю рухаў і канцэнтрацыю ўвагі. Даследчыкі ва Універсітэце Святога Эцьена пратэсціравалі 100 жанчын ва ўзросце 65—85 гадоў. Яны выявілі, што тыя жанчыны, хто штодзень наносіў макіяж, вызначаліся лепшай каардынацыяй рухаў, больш лёгка захоўвалі раўнавагу і менш падалі. Шанц не памерці на працягу года ў выніку пераломy шыйкі сцягна (найбольш распаўсюджаная траўма, якую атрымліваюць пажылыя людзі пры падзенні) павышаецца ў іх на 20%.

## Поўны абзац



**◢ Журналіст прыйшоў у Вярхоўную Раду Украіны ў касцюме зайца. Вядучы праграмы «Сняданак з 1+1» Раман Вінтоніў стварыў сапраўдны ажыятаж у парламенце, калі прыйшоў браць інтэрв'ю ў дэпутатаў у плюшавым касцюме навагодняга зайкі. Ён адзначыў, што вырашыў так апрануцца ў сувязі з апошнімі бойкамі ў Радзе. «Калі ВР ператвараецца ў цырк, то трэба афіцыйна прызнаць гэта і апранацца адпаведным чынам», — сказаў журналіст. Супрацоўнікі прэс-службы паспрабавалі вывесці яго з будынка парламента, але за яго заступіліся калегі, нагадаўшы, што ў парламенце адсутнічае дрэс-код для наведнікаў. Некаторыя з народных абраннікаў адмовіліся даваць каментары зайцу, а, напрыклад, «рэгіяналка» Юлія Левачкіна з задавальненнем сфатаграфавалася з ім.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

Шануй сваё!

# У Лідзе — бульвар князя Гедыміна, у Полацку — вуліца Грунвальдская!

## Астатнія гарады зайздросцяць самым «прасунутым» райцэнтрам

**Лідчукі не перастаюць прыемна здзіўляць. У ліпені, да 600-годдзя Грунвальдскай бітвы, там з'явілася вуліца Грунвальдская. А цяпер вось — бульвар імя князя Гедыміна! Заснавальнік горада ўсё ж, і замак збудаваў ён!**




— Так і пішам людзям у дакументах — «бульвар князя Гедыміна», — кажа **Аляксандр КАСЦЮЧЭНКА, намеснік начальніка Лідскай філіі Гродзенскага абласнога агенцтва дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельнага кадастру**. — Там шмат прыватных, а таксама шматкватэрных дамоў. Так што жыхароў бульвара князя Гедыміна будзе шмат! Раней гэтая вуліца называлася Чапаева. Некаторыя не зусім разумелі, навошта перайменавалі. Я ім тлумачыў, што Гедымін — заснавальнік Ліды. Тады згаджаліся. А вось жыхары вуліцы Ламаносава, якая стала часткай праспекта Перамогі, абураюцца і дагэтуль. Кажуць, Ламаносаў добры чалавек быў!.. Мы, дарэчы, людзям новы адрас рэгіструем бясплатна, і пашпартысты ім рэгістрацыю бясплатна змяняюць — бо гэта выкананне рашэння выканкама.

Нарэшце прыйшла добрая вестка і з Полацка. Шматпакутная вуліца Грунвальдская зацверджаная! Праўда, не там, дзе планавалася.

— Першапачаткова была ідэя перайменаваць вуліцу Войкава, — кажа **Мікалай ІЛЬЮШОНАК, намеснік старшыні Полацкага гарвыканкама**. — Аднак жыхары горада ў часе апытання выказаліся не супраць вуліцы Грунвальдскай, але супраць перайменавання Войкава... Таму і прынялі рашэнне назваць Грунвальдскай вуліцу ў новым мікрараёне. Гэта адпавядае нашай канцэпцыі назваў вуліц — бо ў новым мікрараёне вуліцы ў нас будуць названыя толькі ў гонар гістарычных асобаў, звязаных з Полацкам. Там ужо ёсць вуліца Хруцкага, праспект дойліда Іаана...

***— Спадар Мікалай, але чаму не перайменавалі Войкава — ён жа ўдзельнічаў у забойстве царскай сям'і?!.***

— Я гэта разумею. Але жыхары кажуць, што гэта — таксама гісторыя...

***— Вы вельмі хацелі назваць вуліцу Грунвальдскую да 600-годдзя бітвы. Чаму так прыпазніліся?***

— Таму што думка людзей была неаднастайная, мы шукалі варыянт, які ўсіх задаволіць. А наконт прыпазнення... Я лічу, што юбілей — гэта не толькі 15 ліпеня, а ўвесь 2010 год. І мы давялі справу да канца ў гэтым годзе!

Спадар Мікалай кажа, што ў новым раёне запраектаваныя яшчэ дзве новыя вуліцы. Так што неўзабаве, будзем спадзявацца, іншыя імёны выбітных палачан адлюструюцца на мапе горада.

Мікалай Ільюшонак кажа, што ў планах на гэты год — усталяваць помнік дойліду Іаану. А лідчукі, дарэчы, хочуць бачыць у горадзе помнік вялікаму князю Гедыміну. Вітайма ж вяртанне вялікіх беларусаў на вуліцы нашых гарадоў!

ТЫМ ЧАСАМ

## Наваполацк зайздросціць Полацку!

**— Белай зайздрасцю! — кажа Зміцер ШЧЭРБІК, адзін з вялікіх прыхільнікаў перайменавання вуліцы Грунвальскай, выкладчык юрфака Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат юрыдычных навук. — Ім — і Грунвальдская, і Хруцкага, і дойліда Іаана. А нам — адна «беларуская» вуліца на ўвесь горад: Якуба Коласа! Астатнія нейкія «абстрактныя» — Маладзёжная, Алімпійская, Камсамольская... У нас збудаваны новы мікрараён, збіраюцца будаваць яшчэ два. Чаму б не назваць новыя вуліцы ў гонар нашых герояў? Скажам, у нас ёсць бібліятэка Караткевіча, пісьменнік бываў тут — добра было б і вуліцу назваць! Народны пісьменнік Беларусі Васіль Быкаў нарадзіўся не так далёка... Вялікі канцлер Леў Сапега — таксама з суседняга раёна... У наступным годзе спаўняецца 150 гадоў з дня смерці вялікага містыфікатара пісьменніка Яна Баршчэўскага. І ягоную вуліцу хочацца бачыць у горадзе! Можна было б і ў гонар ягонага героя шляхціца Завальні назваць. Годных асобаў шмат, спадзяюся, на іх не забудуцца!..**

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**

## ТРОХГАДОВЫ ХЛОПЧЫК ЗАСТАЎСЯ БЕЗ БАЦЬКОЎ

**У полымі таксама загінулі яго два браты — двух і васьмі гадоў.**

Апоўначы чатыры аддзяленні выратавальнікаў разам з медыкамі, супрацоўнікамі РАУС і райгазу прыехалі па выкліку ў пасёлак Майскі Добрушскага раёна. Дом з бярвення гарэў усярэдзіне. Калі пажар быў ліквідаваны, пры разборцы канструкцый былі знойдзены трупы жанчыны, мужчыны і дваіх дзяцей. Як паведамілі ў прэс-службе Гомельскага абласнога МНС, шматдзетная сям'я стаяла на ўліку як сацыяльна небяспечная ў аддзелах адукацыі і сацыяльнай абароны Добрушскага райвыканкама. Высветлілася, што напярэдадні сужэнцы разам з дзецьмі хадзілі ў госці да суседзяў, дзе ўжывалі спіртныя напоі. Вечарам гаспадыня з сужыцелем, малодшым і старэйшым сынамі вярнуліся дадому, а сярэдні заснуў і застаўся ў суседзяў. Дзякуючы гэтым выпадковым абставінам трохгадовы хлопчык застаўся жывы. Мяркуецца, што прычынай трагедыі стала непатушаная цыгарэта.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Рашэнне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь

# АБ ДЗЕЯННІ НАРМАТЫЎНАГА ПРАВАВОГА АКТА Ў ЧАСЕ ПРЫ СПЫНЕННІ ДЭЛЕГАВАНЫХ ПАЎНАМОЦТВАЎ НА ЯГО ПРЫНЯЦЦЕ (ВЫДАННЕ)

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у складзе старшынствуючага — Старшыні Канстытуцыйнага Суда Міклашэвіча П.П., намесніка Старшыні Марыскіна А.У., суддзяў Бойка Т.С., Вараноўча Т.В., Данілюка С.Я., Ізоткі У.П., Козыравай Л.Р., Падгрушы В.В., Рабцава Л.М., Сяргеевай В.Г., Цікавенкі А.Г., Чыгрынава С.П.

з удзелам прадстаўнікоў:

Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь — Герасімава В.М., начальніка галоўнага экспертна-прававога ўпраўлення Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь;

Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь — Марозавай І.Ч., начальніка юрыдычнага ўпраўлення Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь;

Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь — Хлабардова У.А., начальніка юрыдычнага ўпраўлення Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь;

Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь — Білейчыка А.У., першага намесніка Міністра юстыцыі Рэспублікі Беларусь,

на падставе часткі восьмай артыкула 22 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў

у парадку рэалізацыі права на ўнясенне Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, у палаты Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, іншыя дзяржаўныя органы ў адпаведнасці з іх кампетэнцыяй прапаноў аб неабходнасці ўнясення ў акты заканадаўства змяненняў і (або) дапаўненняў

разгледзеў у судовым пасяджэнні пытанне аб дзеянні нарматыўнага прававога акта ў часе пры спыненні дэлегаваных паўнамоцтваў на яго прыняцце (выданне).

Прычынай для разгляду пытання з'явіўся зварот Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь. У звароце ўказана, што ў ходзе правядзення работнікамі гэтага Камітэта праверачных мерапрыемстваў устаноўлены факты парушэння патрабаванняў Асноўных палажэнняў па складзе затрат, якія ўключаюцца ў сабекошт прадукцыі (работ, паслуг), зацверджаных пастановай Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь ад 30 кастрычніка 2008 г. № 210/161/151. Паўнамоцтвы на прыняцце гэтай пастановы былі дэлегаваны ўказаным органам пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 23 ліпеня 2001 г. № 1081 «О составе затрат, включаемых в себестоимость продукции (работ, услуг)» (далей — пастанова № 1081), а Савету Міністраў, у сваю чаргу, аналагічныя паўнамоцтвы дэлегаваны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 5 лютага 1997 г. № 132 «О расширении полномочий Совета Министров Республики Беларусь» (далей — Указ № 132).

У звароце таксама адзначана, што Указ № 132 прызнаны страціўшым сілу Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 23 верасня 2010 г. № 484 «О признании утратившим силу Указа Президента Республики Беларусь от 5 февраля 1997 г. № 132». У сувязі з тым, што ўпаўнаважаныя дзяржаўныя органы страцілі права на прыняцце вышэйназваных Асноўных палажэнняў, пры ўстанаўленні факта парушэння фарміравання цаны з парушэннем патрабаванняў аб фарміраванні сабекошту, прадугледжаных у Асноўных палажэннях па складзе затрат, якія ўключаюцца ў сабекошт прадукцыі (работ, паслуг), узнікае пытанне аб правамернасці стаўлення ўказанага парушэння ў віну адпаведным службовым асобам. Па меркаванні Камітэта дзяржаўнага кантролю, прымяненне мер адміністрацыйнай адказнасці ў гэтай сітуацыі абгрунтавана, паколькі Законам Рэспублікі Беларусь «О нормативных правовых актах Республики Беларусь» не прадугледжваецца адначасовая адмена або прызнанне страціўшым сілу нарматыўнага прававога акта, выдадзенага на падставе дэлегаваных паўнамоцтваў, у выпадку прызнання страціўшым сілу акта, якім вышэйуказаныя паўнамоцтвы былі прадастаўлены.

Такім чынам, у працэсе праваприменення выяўляецца нявызначанасць у пытанні аб тым, ці дзейнічае нарматыўны прававы акт, выдадзены дзяржаўным органам на падставе дэлегаваных яму на прыняцце (выданне) такога акта паўнамоцтваў, пры спыненні гэтых паўнамоцтваў.

Прааналізаваўшы нормы Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (далей — Канстытуцыя), Закона «О нормативных правовых актах Республики Беларусь», прызнаных страціўшымі сілу Указа № 132 і пастановы № 1081, іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь, Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь устанавіў наступнае.

1. У адпаведнасці з часткай першай артыкула 7 Канстытуцыі ў Рэспубліцы Беларусь устанаўліваецца прынцып вяршэнства права. З канстытуцыйна-прававога сэнсу дадзенай нормы вынікае, што ў нарматворчай дзейнасці павінен выконвацца прынцып прававой дакладнасці, які прадугледжвае яснасць, пэўнасць, несупярэчлівасць, лагічную ўзгодненасць прававых норм.

У сілу артыкула 5 Закона «О нормативных правовых актах Республики Беларусь» нарматыўныя прававыя акты прыводзяцца ў адзіную сістэму шляхам іх узаемнага ўзгаднення, а ў адпаведнасці з артыкулам 7 гэтага ж Закона нарматворчая дзейнасць ажыццяўляецца ў тым ліку на прынцыпах канстытуцыйнасці, адпаведнасці актаў ніжэйстаячых дзяржаўных органаў (службовых асоб) актам Кіраўніка дзяржавы і вышэйстаячых дзяржаўных органаў, сістэмнасці і комплекснасці прававога рэгулявання грамадскіх адносін.

2. У адпаведнасці з артыкулам 55 Закона «О нормативных правовых актах Республики Беларусь» нарматворчы орган (службовая асоба) мае права дэлегаваць частку сваіх нарматворчых паўнамоцтваў іншым нарматворчым органам (службовым асобам), калі гэта не супярэчыць Канстытуцыі і іншым заканадаўчым актам Рэспублікі Беларусь. У нарматыўным прававым акце аб дэлегаванні паўнамоцтваў указваецца, якому дзяржаўнаму органу (службовай асобе) і на які тэрмін дэлегуецца паўнамоцтва, а таксама вызначаюцца іншыя ўмовы, у тым ліку ўмовы, што ўстанаўліваюць граніцы рэалізацыі дэлегаванага паўнамоцтва. Дзяржаўны орган (службовая асоба), прымаючы (выдаючы) нарматыўны прававы акт у парадку рэалізацыі дэлегаваных паўнамоцтваў, абавязаны спасылацца на нарматыўны прававы акт, якім яму дэлегаваны адпаведныя паўнамоцтвы.

Згодна з пунктам 5 Правілаў падрыхтоўкі праектаў нарматыўных прававых актаў, зацверджаных Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 11 жніўня 2003 г. № 359 «О мерах по совершенствованию нормотворческой деятельности», не дапускаецца прыняцце (выданне) актаў дзяржаўнымі органамі (арганізацыямі) і службовымі асобамі, якія не маюць паўнамоцтваў на прыняцце (выданне) актаў у адпаведнасці з Законам «О нормативных правовых актах Республики Беларусь», калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

У пункце 35 указаных Правілаў замацоўваецца, што нарматворчы орган (службовая асоба) дэлегуе частку сваіх нарматворчых паўнамоцтваў іншым нарматворчым органам (службовым асобам), калі гэта не супярэчыць Канстытуцыі і іншым заканадаўчым актам. Пры гэтым не дапускаецца дэлегаванне паўнамоцтваў на прыняцце (выданне) актаў нарматворчым органам (службовай асобай) іншаму нарматворчаму органу (службовай асобе) аднаго ўзроўню.

Такім чынам, заканадаўчымі актамі ўрэгуляваны адносіны, якія датычацца магчымасці дэлегавання нарматворчым органам часткі сваіх паўнамоцтваў на прыняцце (выданне) нарматыўнага прававога акта іншым нарматворчым органам (службовым асобам).

3. Дзеянне нарматыўнага прававога акта ў часе характарызуецца ў тым ліку спыненнем яго дзеяння.

Прававыя падыходы да вырашэння пытанняў, звязаных са спыненнем дзеяння нарматыўнага прававога акта, замацаваны ў Законе «О нормативных правовых актах Республики Беларусь». У адпаведнасці з артыкулам 69 гэтага Закона нарматыўны прававы акт (яго частка) спыняе сваё дзеянне ў наступных выпадках: сканчэнне тэрміну, на які быў разлічаны часовы акт (яго частка); прызнанне нарматыўнага прававога акта (яго часткі) неканстытуцыйным ва ўстаноўленым законам парадку; прызнанне нарматыўнага прававога акта (яго часткі) страціўшым сілу; адмена нарматыўнага прававога акта ў выпадках, прадугледжаных Канстытуцыяй і іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

У артыкуле 58 Закона «О нормативных правовых актах Республики Беларусь» вызначаны парадак прызнання нарматыўнага прававога акта страціўшым сілу. Так, у сувязі з прыняццем (выданнем) нарматыўнага прававога акта падлягаюць прызнанню страціўшымі сілу ўсе акты той жа або меншай юрыдычнай сілы або іх часткі, калі яны супярэчаць уключаным у новы акт нарматыўным прававым прадпісанням, або ўвабраны ім, або фактычна страцілі сваё значэнне.

Пры гэтым згодна з артыкулам 59 указанага Закона пералік нарматыўных прававых актаў (іх структурных элементаў), якія падлягаюць прызнанню страціўшымі сілу ў сувязі з прыняццем (выданнем) нарматыўнага прававога акта, павінен змяшчацца ў заключных палажэннях гэтага нарматыўнага прававога акта або ў дадатку да яго. Пералікі нарматыўных прававых актаў, якія падлягаюць прызнанню страціўшымі сілу, могуць афармляцца ў выглядзе самастойнага праекта і прадстаўляцца адначасова з праектам асноўнага акта ў выпадку, калі маецца значная колькасць такіх нарматыўных прававых актаў. Падрыхтоўка праектаў пералікаў нарматыўных прававых актаў, якія падлягаюць прызнанню страціўшымі сілу, пасля прыняцця (выдання) нарматыўнага прававога акта дапускаецца як выключэнне, калі іх падрыхтоўка патрабуе працяглага часу. У такім выпадку ў даручэнні аб распрацоўцы праектаў адпаведных пералікаў указваецца, на якія дзяржаўныя органы (арганізацыі) ускладаецца іх распрацоўка, і вызначаецца тэрмін прадстаўлення гэтых праектаў у нарматворчы орган (службовай асобе).

Прыведзеныя нарматыўныя палажэнні артыкула 59 Закона «О нормативных правовых актах Республики Беларусь», зыходзячы з іх прававога сэнсу, вызначаюць механізм прызнання страціўшымі сілу нарматыўных прававых актаў, прынятых (выдадзеных) тым жа дзяржаўным органам, які раней прыняў (выдаў) нарматыўны прававы акт. Механізм жа спынення дзеяння актаў шляхам прызнання страціўшымі сілу нарматыўных прававых актаў, прынятых (выдадзеных) у парадку дэлегавання паўнамоцтваў на іх прыняцце (выданне), у Законе «О нормативных правовых актах Республики Беларусь» не прадугледжаны, у той час як права і парадак дэлегавання такіх паўнамоцтваў рэгламентаваны. У дадзеным Законе не вызначаны таксама патрабаванні да ўстанаўлення часу (моманту) прызнання нарматыўнага прававога акта страціўшым сілу. Указаныя прабелы, якія маюць месца ў Законе «О нормативных правовых актах Республики Беларусь», на думку Канстытуцыйнага Суда, параджаюць нявызначанасць у прававым рэгуляванні і праваприменении.

4. Практыка нарматворчай дзейнасці сведчыць аб тым, што пры прызнанні страціўшым сілу акта аб дэлегаванні паўнамоцтваў на прыняцце (выданне) нарматыўнага прававога акта нарматворчы орган дае даручэнне адпаведным дзяржаўным органам прывесці іх нарматыўныя прававыя акты ў адпаведнасць з прынятым (выдадзеным) актам аб адмене дэлегаваных паўнамоцтваў. Пры гэтым нарматворчы орган кіруецца патрабаваннямі артыкула 58 Закона «О нормативных правовых актах Республики Беларусь» аб неабходнасці (у сувязі з прыняццем (выданнем) нарматыўнага прававога акта) прызнання страціўшымі сілу актаў той жа або меншай юрыдычнай сілы, калі яны супярэчаць уключаным у новы акт нарматыўным прававым прадпісанням, або ўвабраны ім, або фактычна страцілі сваё значэнне.

Прымаючы да ўвагі выкладзенае, Канстытуцыйны Суд лічыць, што пры спыненні дэлегаваных паўнамоцтваў на прыняцце (выданне) нарматыўнага прававога акта, зыходзячы са зместу норм артыкула 10 Закона «О нормативных правовых актах Республики Беларусь» аб юрыдычнай сіле нарматыўных прававых актаў, момант (час) прызнання страціўшым сілу нарматыўнага прававога акта, прынятага на падставе дэлегавання паўнамоцтваў, павінен, як правіла, супадаць з момантам (часам) спынення дэлегаваных паўнамоцтваў. Такі парадак дазволіць выключыць няяснасці і спрэчкі, якія ўзнікаюць у сувязі з гэтым і датычацца прымянення нарматыўных прававых актаў.

Адначасова з адзначаным пры наяўнасці пэўных аб'ектыўных акалічнасцяў неабходна ў самім акце, што спыняе дэлегаванне паўнамоцтваў, прадугледжваць тэрмін, пасля сканчэння якога гэты акт уступае ў сілу, і даручэнні дзяржаўным органам ва ўстаноўлены тэрмін забяспечыць прывядзенне сваіх нарматыўных прававых актаў у адпаведнасць з прынятым актам. У гэтым выпадку праекты нарматыўных прававых актаў аб прызнанні актаў страціўшымі сілу, аб унясенні ў акты змяненняў і (або) дапаўненняў або праекты новых нарматыўных прававых актаў распрацоўваюцца і прымаюцца ўпаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі з такім разлікам, каб яны ўступілі ў сілу з даты ўступлення ў сілу новага нарматыўнага прававога акта.

Па меркаванні Канстытуцыйнага Суда, у сувязі з прыняццем (выданнем) нарматыўнага прававога акта, які адмяняе паўнамоцтва нарматворчага органа на прыняцце (выданне) нарматыўных прававых актаў у парадку дэлегавання, таксама магчыма дзеянне акта, які павінен быць прызнаны страціўшым сілу, да прыняцця замест яго іншага нарматыўнага прававога акта іншым дзяржаўным органам (службовай асобай) або дзеянне яго на працягу пэўнага часу, калі ў гэтым прынятым (выдадзеным) акце прадугледжаны парадак спынення дзеяння акта, які падлягае прызнанню страціўшым сілу. Такі падыход з прававога пункту гледжання апраўданы і абгрунтаваны, паколькі дазволіць забяспечыць бясспрэчнасць, яснасць, недвухсэнсавасць прававых норм, іх узгодненасць у сістэме прававога рэгулявання. Важным з'яўляецца ўстанаўленне разумнага па працяглацсці тэрміну дзеяння такога акта з улікам таго, што прававое рэгуляванне грамадскіх адносін з адменай дэлегавання зменена.

Канстытуцыйны Суд звяртае ўвагу на тое, што дакладнае ўстанаўленне часавых граніц дзеяння нарматыўных прававых актаў з'яўляецца неабходным патрабаваннем прававога рэгулявання. Гэта абумоўлена тым, што такім чынам выяўляецца нарматыўны прававы акт, які на дадзены момант рэгулюе канкрэтныя грамадскія адносіны, а таксама забяспечваюцца эфектыўнасць прававых норм і дасягненне мэт прававога рэгулявання. З граніцамі дзеяння нарматыўнага прававога акта ў часе звязана ажыццяўленне патрабаванняў прававой дакладнасці. Рэгламентацыя такіх граніц у новым нарматыўным прававым акце павінна забяспечваць своечасовую адмену іншых нарматыўных прававых актаў у мэтах выключэння выпадкаў неабгрунтаванага, адвольнага прымянення акта да адносін, на якія ўжо не распаўсюджваецца яго дзеянне.

У Законе «О нормативных правовых актах Республики Беларусь» — заканадаўчым акце, які ўстанаўлівае агульны парадак падрыхтоўкі, афармлення, прыняцця (выдання), у тым ліку пры дэлегаванні паўнамоцтваў на прыняцце (выданне), і дзеяння нарматыўных прававых актаў, адсутнічаюць палажэнні, якія рэгламентуюць у прымяненні да выпадку адмены дэлегавання нарматворчых паўнамоцтваў парадак і тэрміны прызнання страціўшымі сілу нарматыўных прававых актаў, прынятых (выдадзеных) на падставе дэлегаваных паўнамоцтваў.

Канстытуцыйны Суд лічыць, што замацаванне ў нарматыўных прававых актах палажэнняў аб парадку і тэрмінах прызнання страціўшымі сілу нарматыўных прававых актаў у сувязі са спыненнем паўнамоцтваў дзяржаўнага органа на прыняцце (выданне) нарматыўных прававых актаў у парадку дэлегавання будзе садзейнічаць забеспячэнню рэалізацыі канстытуцыйнага прынцыпу вяршэнства права і вынікаючага з яго прынцыпу прававой дакладнасці.

На падставе выкладзенага, кіруючыся часткай восьмай артыкула 22 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў, Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь

**ВЫРАШЫЎ:**

1. Прызнаць неабходным у мэтах забеспячэння канстытуцыйнага прынцыпу вяршэнства права, вынікаючага з яго прынцыпу прававой дакладнасці і ўстаранення прабелу ў заканадаўстве ў частцы дзеяння норм права ў часе рэгламентаваць на заканадаўчым узроўні пытанні, звязаныя з устанаўленнем парадку і тэрмінаў прызнання страціўшымі сілу нарматыўных прававых актаў, прынятых (выдадзеных) у парадку дэлегавання паўнамоцтваў на іх прыняцце (выданне), у сувязі са спыненнем дэлегаваных паўнамоцтваў дзяржаўнага органа на прыняцце (выданне) акта.

2. Прапанаваць Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь распрацаваць і ўнесці ва ўстаноўленым парадку ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь праект закона аб унясенні ў Закон Рэспублікі Беларусь «О нормативных правовых актах Республики Беларусь» адпаведных змяненняў і (або) дапаўненняў.

3. Гэта рашэнне ўступае ў сілу з дня прыняцця.

4. Апублікаваць гэта рашэнне ў адпаведнасці з заканадаўствам.

**Старшынствуючы —**
**Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь**
**П.П. МІКЛАШЭВІЧ**

*15 снежня 2010 г., г. Мінск*
*№ Р-524/2010*

# «Быў бы меншым падаходны падатак з гаспадароў жылля, мы б менш плацілі за наём кватэры?»

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

***З сельскай мясцовасці на «гарачую лінію» газеты патэлефанавала жанчына з пытаннем, якое тычылася найму жылля. Дакладней, узаемасувязі паміж платай за яго тымі, хто здымае кватэру, і сумай падаходнага падатку, што плаціць ужо гаспадар квадратных метраў. Каб было больш зразумела, прывядзём цалкам невялікі аповед заяўніцы.***

— Нашы дзеці скончылі школу і паступілі вучыцца ў сталіцу. Даводзіцца здымаць кватэру, за якую павінны плаціць 300 долараў. Гэта дарагавата, аднак на нашы заўвагі і просьбы гаспадары кватэры адказваюць, што, маўляў, вымушаны трымаць высокую цану, бо здаюць жыллё афіцыйна, а значыць, плацяць падаходны падатак. Яшчэ кажуць, што каб гэты падатак быў меншым, дык і яны б знізілі сваю цану. Можа, падкажаце, ці плануюцца якія змены ў гэтай частцы падатковага заканадаўства? — гаварыла жанчына.

Інфармацыя, відавочна, была самай агульнай. Тым не менш мы звярнуліся па дапамогу ў **інспекцыю Міністэрства па падатках і зборах па г. Мінску**. Яе **прэс-сакратар Аляксей ШАТОХА** даволі аператыўна падрыхтаваў падрабязны адказ на наш запыт.

— У адпаведнасці з патрабаваннямі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 4.08.2006 г. №497 «Аб аплаце падаходнага падатку ў фіксаваных сумах», фізічная асоба, што вырашыла здаць жылое памяшканне ў наём, абавязана першапачаткова заключыць дагавор арэнды (субарэнды), найму (паднайму) памяшкання ў пісьмовай форме, які, да ўстаноўленага ў ім тэрміну фактычнага прадастаўлення памяшкання, падлягае рэгістрацыі ў мясцовым выканаўчым і распарадчым органе або ў жыллёва-эксплуатацыйнай ці іншай арганізацыі, што вядзе эксплуатацыю адпаведнага жылога дома або па месцы жыхарства фізічнай асобы, або па месцы знаходжання памяшкання, якое здаецца. Форма такога дагавора зацверджана заканадаўча і атрымаць яе можна ў рэгіструючай арганізацыі. Варта адзначыць, што незахаванне ўстаноўленай заканадаўствам формы дагавора, таксама як і не заключэнне дагавору ў пісьмовай форме, не вызваляе фізічную асобу ад абавязку аплаты падаходнага падатку, — паведаміў Аляксей Юр'евіч.

Паводле яго далейшых слоў, акрамя таго, вышэйназваным Указам устаноўлены межы падатковых ставак падаходнага падатку з даходаў фізічных асоб, што не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія атрыманыя ад здачы іншым фізічным асобам у арэнду (субарэнду), наём (паднаём) жылых і (ці) нежылых памяшканняў, якія знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, у памеры, які не перавышае 500 базавых велічынь у падатковым перыядзе (каляндарным годзе), што вызначаецца на дату фактычнага атрымання даходу.

— Зараз у сталіцы стаіць на ўліку больш за 34 тысячы фізічных асоб, што на платнай аснове прадастаўляюць у доўгатэрміновы наём іншым фізічным асобам свае памяшканні, якія пустуюць. Для Мінска фіксаваныя сумы падаходнага падатку ўстаноўлены рашэннем Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў ад 25.09.2006 г. № 259 у залежнасці ад размяшчэння памяшкання па эканоміка-планіровачных зонах. Прычым стаўка падаходнага падатку ў сталіцы за здачу жылых памяшканняў за кожны пакой, што здаецца, складае ў базавых велічынях: у першай эканоміка-планіровачнай зоне (а гэта цэнтр горада) — 2; у другой — 1,5; у трэцяй, чацвёртай і пятай эканоміка-планіровачных зонах — 1. Напрыклад, за здачу ў наём двухпакаёвай кватэры ў цэнтры горада падаходны падатак складзе чатыры базавыя велічыні (140 тысяч рублёў), а на ўскраіне — дзве базавыя велічыні (70 тысяч рублёў), — распавёў Аляксей Шатоха. — Прадугледжаны і выпадкі, пры якіх падаходны падатак не выплачваецца. Гэта калі жылое памяшканне здаецца ў наём маладым спецыялістам, — выпускнікам устаноў адукацыі, якія атрымалі прафесійна-тэхнічную, сярэдне-спецыяльную і вышэйшую адукацыю ў дзённай форме навучання за кошт сродкаў бюджэту і накіраваным на працу па размеркаванні.

Наколькі стала зразумелым з аповеду заяўніцы, апошняя акалічнасць не мае дачынення да нашай сітуацыі: дзеці яшчэ толькі паступілі вучыцца, а не з'яўляюцца выпускнікамі. А вяртаючыся ўвогуле да пытання, спадзяёмся, жанчына зразумела, што асаблівай сувязі паміж сумай падаходнага падатку, які плаціць уладальнік кватэры, і тымі грашыма, што яны павінны плаціць ужо гаспадару жылля, няма. Пагадзіцеся, нельга параўноўваць больш чым 900 тысяч рублёў штомесяц у якасці платы за наём жылога памяшкання (названыя 300 долараў) з названымі вышэй сумамі падаходнага падатку. Проста ў гаспадароў квадратных метраў такі «фінансавы апетыт».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ТАМ ЧАС НІБЫ СПЫНЯЕЦЦА

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

Кожны чалавек сам выбірае, дзе і як яму адпачываць. Ён гаспадар сваіх грошай. Хочаш гуляць у казіно — гуляй. Але мне здаецца, што нявартa маладым людзям мяняць нармальнае жыццё на існаванне ля рулеткі, знаходзіцца ў стане пастаяннай ліхаманкі — пашанцуе ці не пашанцуе? Ды і ўвогуле, няважна, колькі табе гадоў і які ў цябе сацыяльны статус. Проста навошта ставіць мэтай свайго жыцця перамагчы аўтаматы? Усё роўна казіно заўсёды застанецца ў выйгрышы.

### ПЕРНІКІ КЛІЕНТАМ

Дзеля справядлівасці адзначым, што казіно час ад часу імкнецца падсаладзіць горкую пілюлю небаракам. Калі ты пастаянны кліент або прайграў вялікую суму грошай, цябе суцешаць — пачастуюць бясплатнай выпіўкай, а калі пашанцуе, то і цыгарэтамі. За безалкагольныя напоі плаціць не трэба. Так бы мовіць, «усё ўключана».

Прыкладна раз у месяц адміністрацыя казіно ладзіць забаўляльныя мерапрыемствы. Тэматыка вечарынак самая разнастайная. Напрыклад, «Дзень Кітая» або «Гавайская вечарынка». Колькасць наведнікаў у такія дні павялічваецца ў некалькі разоў. Уваход свабодны, пачастунак і выпіўка бясплатная. Адным словам, халява, сэр! Таксама для іх, любімых, ладзіцца забаўляльная шоу-праграма са спецыяльна запрошанымі гасцямі і артыстамі. Усё дзеля наведнікаў, каб яны не забывалі сюды дарогу.

**Алена ПАРФЁНАВА,**
**студэнтка Белдзяржуніверсітэта.**

# САМАРОБНЫЯ ТРАКТАРЫ З ГЛЫБІНКІ

**Першы раённы конкурс самаробных трактароў адбыўся ў Полацкім раёне. Пераможцаў ушаноўвалі днямі ў аграрным гарадку Гомель. Аўтары самых лепшых мадэляў (а такія вызначалі гледачы — землякі ўдзельнікаў конкурсу) атрымалі памятныя прызы**

На цікавым па-свойму ўнікальным конкурсе было прадстаўлена ажно больш за сорак мадэляў «жалезных коней», зробленых жыхарамі глыбінкі. Цікава, што пасля паказу па тэлебачанні пяці найбольш цікавых і ўдалых мадэляў ў эфіры полацкай тэлерадыёкампаніі «Скіф» пераможцу раённага конкурсу «самаробкіных» выбіралі шляхам СМС-галасавання.

Ініцыятарамі правядзення конкурсу сталі Полацкі райвыканкам, раённыя структуры моладзевай грамадскай арганізацыі «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» і Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь».

Як расказаў «Звяздзе» **рэдактар ТК «Скіф» г. Полацк Аляксей ГОЛУБЕЎ,** у СМС-галасаванні тэлевізійнага конкурсу «Полацкі самаробкін» бралі ўдзел шмат гледачоў, якія адправілі больш за сто СМС-паведамленняў. Больш за палову паведамленняў адрасаваліся мадэлі трактара, якую зрабіў **Вячаслаў Іванавіч ЯДЗЕВІЧ — работнік сельскагаспадарчага кааператыва «Чырвоны партызан».** Аказваецца, ён яшчэ і самаробны грузавік зрабіў. Па жыцці гэты жыхар глыбінкі нешта майструе, прыдумвае. Як кажуць, чалавек з залатымі рукамі...

А перад правядзеннем тэлевізійнага конкурсу на свяце працаўнікоў сельскай гаспадаркі лепшым «самаробкіным» стаў **Васіль Васільевіч ЛАБОВІЧ — майстар Полацкага дзяржаўнага ліцэя сельскагаспадарчай вытворчасці.**

Ідэя правядзення конкурсу «самаробкіных» настолькі спадабалася жыхарам раёна, што ўжо ёсць упэўненасць у тым, што ён стане традыцыйным.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ,** *Полацк.*

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ»

**220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А**
**режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00–14.00,**
**тел.: 227 52 36, 226 03 01**

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Выполняя функции заказчика, объединением с 2004 по 2009 год построены и введены в эксплуатацию жилые дома:

- ул. Захарова, д. 63, ул. Захарова, д. 67, корп. 1, ул. Великоморская, д. 10, ул. Великоморская, д. 12, ул. Роменская, д. 5, ул. Матусевича, д. 90, пр-т Рокоссовского, д. 78, пр-т Рокоссовского, д. 76, пр. Рокоссовского, 80, ул. Филимонова, д. 14, пр-т Независимости, д. 168, корп. 1, пр-т Независимости, д. 168, корп. 2, пр-т Независимости, д. 168, корп. 3, ул. Есенина, д. 30, ул. Есенина, д. 34, ул. Есенина, д. 36.

Лицензия № 02250/0264117 выдана Министерством архитектуры и строительства РБ 09.04.2007 года сроком на пять лет.

**Объединение осуществляет строительство объекта «Квартал жилой застройки по пр. Дзержинского – ул. Алибегова – пр. газеты «Правда». Многоквартирный жилой дом № 10 (по генплану)» в г. Минске.**

Свидетельство (удостоверение) № 500/962-2271 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права собственности на него от 24.06.2010 г.

Земельный участок площадью 0,6362 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Здание жилого дома – 9-этажное, 4-секционное. Количество жилых помещений жилого дома – 116. Серия жилого дома – индивидуальная.

Начало строительства – июль 2010 года.

Предположительное окончание строительства – октябрь 2011 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 22.04.2010 № 223-60/10, от 28.05.2010 № 550-60/10.

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться по истечении 30 дней с момента опубликования настоящей декларации как с гражданами, состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, так и с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, но желающими их улучшить.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений без выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет 3 613 720 рублей.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Договор строительного подряда от 14.06.2010 № 16с-06-2010, генподрядчик – ОАО «Стройтрест № 4».

Информацию о строительстве жилого дома и объектах долевого строительства можно получить в каб. 105 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

**Генеральный директор Е.И. Вовна**

# «САВЕТ ЗЯМЛЯЦТВАЎ» — ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ СУПРАЦОЎНІЦТВА

**Аб стварэнні грамадскай арганізацыі «Савет зямляцтваў БДУ» паведамляе прэс-служба ўніверсітэта. Яе членамі стануць замежныя грамадзяне (студэнты і аспіранты), якія навучаюцца ў ВНУ.**

У структуру Савета ўвайшлі 7 зямляцтваў, якія аб'ядноўваюць студэнтаў па нацыянальнай прыналежнасці ці па «геаграфічным прынцыпе»: зямляцтва прадстаўнікоў Расіі; Туркменістана; Кітая; краін СНД; Паўднёва-Усходняй і Усходняй Азіі; Блізкага Усходу і Афрыкі; Заходняй Еўропы, Прыбалтыкі, ЗША і Паўднёвай Амерыкі. Акрамя таго, для вырашэння арганізацыйна-прававых, жыллёва-бытавых праблем, пытанняў, звязаных з навучаннем, арганізацыяй культурна-масавай работы, а таксама рэгуляваннем спартыўнай і рэкламна- інфармацыйнай дзейнасці Савета, створаны 6 сектараў. Старшынёй новай грамадскай арганізацыі абраны студэнт 3 курса эканамічнага факультэта Мухамед Юмудаў з Туркменістана.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Минский городской центр недвижимости

## Извещение о проведении 24 января 2011 года открытого аукциона по продаже единым комплексом зданий и сооружений ЗАО «Снечкус»:

| | | Инв. № (кадастр.) |
|---|---|---|
| Предмет торгов (наименование и характеристики продаваемого имущества) | - торговый центр «Степянка» (здание специализированное розничной торговли, литер А 2/к) общей площадью 1119,2 кв. м; | 500/С-34657 |
| | - сооружение торговых павильонов (литер В 1/м) общей площадью 173,4 кв. м; | 500/С-34929 |
| | - здание бытового назначения (литер Б 1/к) общей площадью 39,3 кв. м. | 500/С-34928 |
| Сведения о земельном участке | Кадастровый номер 500000000001002650, площадь – 0,3744 га | |
| Местонахождение продаваемого имущества | г. Минск, ул. Карвата, д. 4 | |
| Сведения о продавце | ЗАО «Снечкус», ул. Карвата, д. 4, 220138, г. Минск, телефоны (017) 290 51 90, (029) 627 60 15 | |
| Сведения об организаторе аукциона | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, телефон (017) 227 48 36 | |
| Начальная цена предмета торгов с учетом НДС | 7 575 000 000 белорусских рублей | |
| Сумма задатка | 300 000 000 белорусских рублей | |
| Наличие обременений | Аренда, ипотека | |

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012037450010, в филиале ОАО «БПС-Банк» по г. Минску, код 153001334, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Аукцион состоится **24 января 2011 года** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 22.12.2010 по 21.01.2011 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 227 48 36, (017) 290 51 90, (029) 627 60 15.**

## Минский районный исполнительный комитет *31 декабря 2010 года* повторно проводит открытый *аукцион* на право заключения договора аренды земельного участка в Минском районе

| | | Лот 1 |
|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Минский район, Горанский с/с, д. Новоселье |
| 2 | Кадастровый номер | 623681315601000471 |
| 3 | Площадь земельного участка | 4,8240 га |
| 4 | Срок аренды (лет) | 51 |
| 5 | Целевое назначение | Для строительства объекта придорожного сервиса |
| 6 | Сумма убытков и потерь с/х производства (рублей) | 30 592 000 |
| 7 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 1 727 348 |
| 8 | Начальная цена права заключения договора аренды | 184 663 доллара США |
| 9 | Задаток (рублей) | 55 000 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **31.12.2010 г. в 9.00.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: 27.12.2010 г. Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3641000233719, отделение № 537, г. Минск, ОАО «Белинвестбанк», МФО 153001739, УНП 600068187, получатель – Минский районный исполнительный комитет.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить потери сельскохозяйственного производства, вызванные изъятием сельскохозяйственных земель для использования в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства, и расходы, оговоренные в условиях проведения аукциона. Договор аренды земельного участка заключается с победителем в течении 2-х рабочих дней после внесения им всех причитающихся платежей.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками; ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем.

Документы, необходимые для участия в аукционе на право заключения договоров аренды земельных участков:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.
2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

Кроме того, в комиссию представляются:

- гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;
- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

# МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МОГИЛЕВЕ

## Аукцион состоится 25 января 2011 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

| №№ лота | Адрес земельного участка | Площадь, га | Срок аренды | Цель использования, условия продажи | Кадастровый номер | Стоимость землеустроительного дела (руб.) | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| № 1 | Проспект Пушкинский, остановка «Улица Островского» (от центра) | 0,0012 | 1 год | Установка и обслуживание торгового киоска (№ 3) в остановочном павильоне | 740100000005004484 | 1 166 322 | 130 000 | 12 000 |
| № 2 | Район пересечения улиц Габровской и Симонова | 0,5947 | 50 лет | Строительство и обслуживание производственной базы | 740100000005004478 | 1 350 780 | 139 336 000 | 12 540 000 |

**Принимать участие в аукционе могут юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане.**

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют:

Заверенную копию платежного поручения **о внесении задатка** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета **№ 3641017440554** в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 **(разовый платеж)**.

**Юридические лица**: доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

**Индивидуальные предприниматели**: копию свидетельства о государственной регистрации; копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

**Граждане** – копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

**Иностранные юридические лица**: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения, также документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе), либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованными в установленном порядке переводами на белорусский (русский) язык.

**Представители иностранного юридического лица или гражданина:** легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

Юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении **нескольких предметов** аукциона, вносят **задаток** в размере, установленном для предмета аукциона **с наибольшей начальной ценой**.

1) Условия инженерного развития инфраструктуры: земельный участок (ЛОТ № 1) расположен на застроенной территории, в непосредственной близости имеются инженерные коммуникации; земельный участок (ЛОТ № 2) для строительства нового объекта – в соответствии с проектно-сметной документацией.

2) Условие проведения аукциона – наличие не менее двух участников.

3) Условие предоставления земельных участков в аренду: ЛОТ № 1 – согласование типа киоска с управлением архитектуры и градостроительства Могилевского горисполкома.

4) Порядок осмотра на местности земельных участков: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим.

5) В течение **10 рабочих дней** со дня принятия решения о предоставлении в аренду земельных участков победителям аукциона **оплатить стоимость предмета аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона**, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решениях об изъятии земельных участков для проведения аукциона. Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона (на всех победителей) составляет 6 миллионов рублей.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни с 8.00 до 17.00. **Последний день приема заявлений – 19.01.2011 года до 17.00**.

**Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.**

# МОГИЛЕВСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ В г. МОГИЛЕВЕ

## Аукцион состоится 25 января 2011 года в 16.30 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни **с 08.00 до 17.00**. Последний день приема заявлений **– 19.01.2011** года до 17.00.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Условия проведения аукциона – **наличие не менее двух участников**.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон, желающие принять участие в аукционе представляют в сроки, указанные в извещении:

а) квитанцию о **внесении задатка** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета **№ 3641017440554** в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 **(разовый платеж)**;

б) документ, удостоверяющий личность **(паспорт)** покупателя, а в случае участия в аукционе его представителя – **паспорт и нотариально заверенную доверенность**.

Порядок осмотра на местности земельных участков: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: строительство инженерных коммуникаций будет осуществлено в соответствии с ПСД за счет бюджета города. Продажа земельных участков производится без изменения их целевого назначения. Граждане, желающие участвовать в аукционе по нескольким лотам, вносят **задаток** в размере, установленном для земельного участка с наибольшей начальной ценой.

**Победители аукциона обязаны:** в течение десяти рабочих дней после принятия решения о предоставлении земельного участка в частную собственность внести плату за земельный участок (задаток засчитывается при внесении платы); возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения. Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона (на всех победителей) составляет 5 миллионов рублей.

| № Лота | Адрес земельного участка | Площадь, га | Кадастровый номер | Стоимость землеустроительного дела (руб.) | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | переулок 2-й Ровчакова, 1 | 0,1106 | 740100000001005837 | 1 614 769 | 21 969 000 | 1 977 000 |
| Лот № 2 | переулок 2-й Ровчакова, 3 | 0,1106 | 740100000001005836 | 1 614 769 | 21 969 000 | 1 977 000 |
| Лот № 3 | переулок 2-й Ровчакова, 5 | 0,1106 | 740100000001005835 | 1 615 769 | 21 969 000 | 1 977 000 |

**Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 28 января 2011 года проводит 2-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Год выпуска | Наработка в м/ч (износ) | Начальная цена продажи (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 4. | Самолет Ан-24Б № 99902203, дв. Аи-24 с. 2 № Н4912105, дв. Аи-24 с. 2 № Н4012035, дв. ТГ-16 № АТ945005, 5 402 посадки, 3 КВР-1994 г. | н.п. Мачулищи в/ч 06752 | 1969 | 5 118 | 650 000 000 | 65 000 000 |
| 5. | Вертолет Ми-26 № 34001212099, дв. Д-136 № 2251364001029, дв. Д-136 № 2251362601143, вспомогательная силовая установка ТА-8В № 612А8В010 | н.п. Мачулищи в/ч 06752 | 1986 | 590 | 3 680 000 000 | 368 000 000 |
| 6. | Вертолет Ми-26 № 34001212131, дв. Д-136 № 2251364001063, дв. Д-136 № 2251364001064, вспомогательная силовая установка ТА-8В № 722А8В017 | н.п. Мачулищи в/ч 06752 | 1987 | 594 | 3 870 000 000 | 387 000 000 |
| 7. | Вертолет Ми-26 № 34001212104, дв. Д-136 № 2251364001067, дв. Д-136 № 2251364001068, вспомогательная силовая установка ТА-8В № 622А8В006 | н.п. Мачулищи в/ч 06752 | 1986 | 593 | 3 680 000 000 | 368 000 000 |
| 8. | Вертолет Ми-26 № 34001212018, КАУ-140 № 82110014030, КАУ-140 № 821100140032, КАУ-140 № 821110140041, КАУ-140-01 № 821033010004, дв. ТА-8В № 042А8В058, 1 КВР-1990 г. | н.п. Мачулищи в/ч 06752 | 1983 | 1 774 | 2 270 000 000 | 227 000 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, в 11.00, **28 января 2011 г.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до 17.00 **26 января 2011 года.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи **28 января 2011 года.**
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества **до 1 марта 2011 года.**

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018, код 357, в Октябрьском отд. ОАО «БПС-Банк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 278 06 97, факс 224 20 01. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by.**

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».**
**Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.**
**Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Анатоль СЛАНЕЎСКІ.**
**Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.**
**Кантактны тэлефон: 292 44 12.**
**e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by.**
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».**
**ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**
**Тыраж 33.310. Нумар падпісаны ў 19.30.**

## ААТ «Дзятлаўскі сыраробны завод»

# СМАК САПРАЎДНАГА АДКРЫЦЦЯ

**З выдатнымі вынікамі заканчваюць год працаўнікі Дзятлаўскага сыраробнага завода. Гэтаму ў пераважнай ступені садзейнічалі тэхнічнае абнаўленне прадпрыемства, напружаная праца ўсяго калектыву. Дзятлаўскія сыры карыстаюцца добрай папулярнасцю ў спажыўцоў і разыходзяцца, што называецца, «з колаў». Дзятлаўскія сыры часам характарызуюць такім чынам: «Смак сапраўднага адкрыцця». У свой час прадпрыемства зарэгістравала наступную гандлёвую марку: «Сырная краіна».**





— Вы ведаеце, як нараджаецца сыр? Не? Гэта вельмі цікавы працэс; цікава, як з абсалютна вадкай фракцыі сырога малака раптам утвараецца сырнае зерне, як з апошняга фарміруецца сырны маналіт...

Так казалі падчас гутаркі на Дзятлаўскім сыраробным заводзе яго спецыялісты. Аднак паслухаем іх далей:

— А ўжо за гэтым маналітам трэба ўважліва даглядаць, як за дзіцяткам. Сыр — гэта той жа жывы арганізм, які патрабуе менавіта вось такога догляду, патрабуе ўважлівага назірання за ўсімі працэсамі, і асабліва за паспяваннем. І толькі тады сыр атрымаецца добрым... А ведаеце, як можна дакладна вызначыць, што сыр удаўся? Разрэжце яго, і там, на зрэзе, у агульным малюнку, павінны быць асобныя вочкі, слёзкі. Сыраробы так і кажуць: «Сыр плача — майстар скача», а гэта значыць — радуецца...

* * *

Першае, што, ужо пачынаючы з прахадной, настойліва кідаецца ў вочы на Дзятлаўскім сыраробным заводзе, гэта тое, што тут пануюць выключная чысціня і стэрыльнасць вытворчасці; тут, так бы мовіць, — усё блішчыць. «А ў малакаперапрацоўцы так і павінна быць, — адказвалі на гэта тэхнолаг Дзятлаўскага сыраробнага завода Алена Якімчык і начальнік вытворчай лабараторыі Марына Навіцкая. — Варта памятаць: малочныя прадукты асабліва ўразлівыя да мікрабіялагічнага асяроддзя...». А яшчэ Алена Якімчык і Марына Навіцкая нагадалі: той жа абсалютнай стэрыльнасці вытворчасці, строгага захоўвання ўсіх належных санітарных нормаў і правіл патрабуе міжнародная сістэма ХАСП, якая дзейнічае на прадпрыемстве і якая, нагадаем, выстаўляе самыя жорсткія патрабаванні адносна максімальнай бяспекі прадуктаў харчавання для чалавека.

А ці даспадобы дзятлаўскі сыр спажыўцам? Прыгадаем яшчэ раз гутарку са спецыялістамі завода, іх словы наконт таго, як пяшчотна яго трэба даглядаць (а значыць, так і даглядаюць тут). Безумоўна, ён не можа быць не даспадобы. Пацвердзім гэта і адпаведнымі фактамі. Як расказала начальнік аддзела забеспячэння і збыту Людміла Лявонава, дзятлаўскі сыр ведаюць нават на расійскім Далёкім Усходзе. Вось якое электроннае пісьмо тут атрымалі:

«Здравствуйте, Дятловский сыродельный завод! В далёком городе Владивостоке купили ваш сыр «Костромской». Очень понравился. Спасибо вам большое!..».

А яшчэ на дзятлаўскім заводзе нам паказалі пісьмы, з пажаданнямі купіць яго сыр, з Арменіі, Азербайджана, Малдовы...

* * *



Больш за 80 працэнтаў свайго сыру дзятлаўскія малакаперапрацоўшчыкі менавіта экспартуюць. Ён пераважна ідзе ў Расію — у Маскву, Санкт-Пецярбург, Арол, Ніжні Ноўгарад, а сёлета на заводзе знайшлі аптовага расійскага пакупніка і ў Чалябінску (як кажуць самі працаўнікі завода, перавалілі цераз Урал). Свой сыр дзятлаўцы экспартуюць таксама ў Казахстан.

Дарэчы, у чытача можа скласціся ўражанне, што гэты экспарт лёгка дзятлаўцам даецца. Аднак вось што нам таксама расказалі на дзятлаўскім заводзе. Тыя ж расійскія аптовыя пакупнікі, ці, дакладней, іх прадстаўнікі-маркетолагі, калі выбіраюць сабе пастаўшчыка, складваюць гэткую карту з немалым наборам у ёй пэўных ацэначных паказчыкаў па тым ці іншым заводзе (па розных кірунках, а ў першую чаргу, вядома ж, па якасці прадукцыі). І вось з'яўляюцца ў гэтай карце насупраць кожнага паказчыка плюс або мінус. Па дзятлаўскім заводзе, як правіла, усе плюсы.

***

Заваёўваюць дзятлаўскія сыраробы прыхільнасць пакупнікоў (як замежных, так і сваіх, айчынных) не толькі смакавымі якасцямі сваёй прадукцыі, што, напэўна, найбольш важна, але і яе разнастайнасцю. На сённяшні дзень у іх асартыменце — 23 віды цвёрдых сычужных сыроў (на Гродзеншчыне прадпрыемства з'яўляецца адным з найбольш буйных іх вытворцаў), а таксама вялікая колькасць плаўленых сыроў. Прычым гэты асартымент не з'яўляецца застылым — ён пастаянна абнаўляецца, папаўняецца новымі відамі. «Галандскі», «Расійскі», «Кастрамскі» і некаторыя іншыя — гэта ўжо традыцыйныя для нашых малакаперапрацоўшчыкаў сыры. Прысутнічаюць яны і ў дзятлаўскім асартыменце. А вось сыры «Духмяны» (з кменам), «Шляхцінскі», «Нерынга», «Чыз-Лайт», няйначай, яшчэ мала вядомыя шырокаму пакупніку — яны асвоены на заводзе апошнім часам. Прычым тут імкнуцца дагадзіць усім густам пакупніка. Напрыклад, вядома, што апошнім часам многія пачалі аддаваць перавагу нізкакаларыйным сырам, або сырам з адносна невялікай тлустасцю — адпаведна, на заводзе паставілі на паток ужо названыя вышэй сыры «Нерынга» і «Чыз-Лайт» з 30-працэнтнай тлустасцю. Пакуль што аб'ёмы іх выпуску невялікія, але, пры неабходнасці, тут гатовы нарасціць іх вытворчасць. Як падкрэсліваюць на заводзе, усё ў канчатковым выніку залежыць ад пакупніка, менавіта ён і яго схільнасці фарміруюць асартымент. Менавіта яму і імкнуцца дагадзіць.



З Дзятлаўскім сыраробным заводам з задавальненнем супрацоўнічае галіновы навукова-даследчы інстытут. Той жа сыр «Духмяны» распрацаваны менавіта ў ім. Інстытут у свой час усё ніяк не мог размясціць вытворчасць гэтага сыру — у іншых не атрымлівалася. Прапанавалі дзятлаўцам — атрымалася. «А нам у выніку была перададзена бясплатна дакументацыя на выраб гэтага сыру», — падкрэсліваюць спецыялісты завода. Навука звярнулася на дзятлаўскі завод і са сваім новым, эксперыментальным, сырам, для якога вызначаны 9-месячны тэрмін выспявання (звычайна цвёрдыя сыры праходзяць на заводзе гэты працэс, у залежнасці ад віду, на працягу ад 30 да 120 сутак). Не падвялі навукоўцаў на заводзе і на гэты раз. Праўда, дэгустацыя пакуль што не адбылася: сыр яшчэ «ў працэсе».

* * *



Вышэй ужо зазначалася пра адпаведныя адносіны на заводзе да ўсяго таго, што мы звычайна называем культурай вытворчасці. Тут удакладняюць: адпаведная культура вытворчасці мае ў сваёй аснове сучасную, прагрэсіўную тэхналогію... Нядаўна, 1 кастрычніка, тут арганізавалі дзень адкрытых дзвярэй, пры гэтым запрасілі завадчане на прадпрыемства яго былых працаўнікоў, і тыя, так бы мовіць, не пазналі ранейшы завод. Раней працэс вырабу сыру быў даволі працаёмкім і, увогуле, нялёгкім, умовы працы былі далёка не самыя спрыяльныя. Цяпер жа ў цэху, дзе і адбываецца ўсё таінства пераўтварэння малака ў сыр, стаіць камп'ютарызаваная аўтаматычная лінія, якая поўнасцю і ўзяла на сябе ўсе тонкасці гэтага працэсу. Два аператары, якія абслугоўваюць лінію, па сутнасці, толькі сочаць за прыборамі. У 2008 годзе ўвялі гэту лінію і ўжо праз некалькі месяцаў выйшлі на поўную магутнасць. Да гэтага на заводзе выраблялі за суткі 3,2 тоны сыру, а цяпер — 10 тон (дарэчы, а некалі было толькі 400 тон за год. І, адпаведна, крыху больш за адну тону за дзень). З прыходам новай тэхналогіі пашырыліся і тыя ж асартыментныя магчымасці калектыву, а можа, самае галоўнае — працэс вырабу сыру стаў абсалютна закрытым, усе тэхналагічныя працэсы камп'ютарызаваныя. Ужо зазначалася: прадпрыемства атэставанае па сістэме ХАСП. Яго вытворчасць таксама атэставаная на адпаведнасць патрабаванням ІСО 9001; маюць тут і сертыфікат па ІСО 18001 (пытанні аховы працы), на чарзе атрыманне сертыфіката ІСО 14001 (пытанні аховы навакольнага асяроддзя).

* * *



На прадпрыемстве, як падкрэсліваюць тут, узяты курс на паглыбленую перапрацоўку малака. Ужо зазначана: сыры — гэта яго асноўны прадукт, разам з тым тут выпускаюць у невялікай колькасці масла. Што застаецца пасля выпуску сыроў? Сыроватка. Яе раней па сімвалічных цэнах аддавалі гаспадаркам, цяпер жа абястлушчваюць, сепарыруюць, пастэрызуюць і адпраўляюць іншым перапрацоўчым прадпрыемствам. А ўжо ў вельмі хуткім часе (на момант наведвання прадпрыемства адпаведны ўчастак з толькі што зманціраваным на ім абсталяваннем быў практычна гатовы да работы) і сыроватку будуць перапрацоўваць далей — у прыватнасці, канцэнтраваць яе. Як падкрэсліваюць тут, пасля гэтага працэсу будзе заставацца толькі «чысцюткая вада», якую можна будзе выкарыстоўваць для мыйкі абсталявання, малакавозаў, для патрэб уласнай кацельні. Словам, гэта будзе поўнасцю безадходная вытворчасць.

* * *





З 2003 года Дзятлаўскім сыраробным заводам кіруе Аляксандр Дубовік, з прыходам якога і звязваюць на прадпрыемстве ўсе добрыя перамены, што тут адбыліся і адбываюцца апошнім часам. А варта ўдакладніць: не заўсёды дзейнасць прадпрыемства была гэткай жа паспяховай, якой з'яўляецца сёння. Гэтаму, адпаведна, «спрыялі» эканамічны крызіс, які выклікаў падзенне цэн на малочную прадукцыю, і некаторыя іншыя фактары. Аднак прадпрыемства выстаяла ў гэтых умовах, правяло мадэрнізацыю сваёй вытворчасці. Наконт таго, як яно развіваецца цяпер, ужо можна скласці пэўнае ўяўленне па тым, што было сказана вышэй. Пацвердзім сказанае наступнымі лічбамі. У 2009 годзе тэмпы росту вытворчасці склалі тут 116 працэнтаў, пры гэтым тэмпы росту экспарту дасягнулі амаль 270 працэнтаў. Значна прыбавілі на заводзе ў аб'ёмах вытворчасці і ў сёлетнім годзе, а ў аб'ёмах экспарту выраслі яшчэ больш чым у 1,5 раза. Тут пры гэтым маюць добрыя паказчыкі па рэнтабельнасці.

— Асноўная мэта нашай дзейнасці — гэта менавіта рэнтабельная, прыбытковая работа, — падкрэслівае дырэктар прадпрыемства Аляксандр Дубовік. — Менавіта на атрыманне прыбытку, і як мага — большага, усе і працуем. Пакуль што атрымліваецца. Вельмі ўдачную аўтаматычную лінію паставілі па вырабе цвёрдых сычужных сыроў, цяпер вось будзем выпрацоўваць канцэнтраваную сыроватку — метадам так званага зваротнага осмасу (такі метад будзе выкарыстаны ўпершыню ў рэспубліцы; ён — найбольш эфектыўны), ужо ў хуткім часе пачнём выпрацоўваць мяккія сыры, або балгарскія сыры тыпу пасты Філата. Адпаведны бізнэс-план дэталёва пралічаны, таксама павінны быць з прыбыткам...



***— Аляксандр Міхайлавіч, на тое, каб атрымаць добры сыр, уплывае нямала вытворчых фактараў, і гэта, па сутнасці, клопат выключна вашага калектыву. Але ж добры сыр — гэта яшчэ і добрая сыравіна, малако, што, можа, і не зусім падуладнае вам...***

— Чаму ж не? Наладжванне адпаведных адносін з сельскагаспадарчымі кааператывамі — гэта таксама вельмі вялікая і важная частка нашай работы. Можна быць нават вельмі высокакваліфікаваным спецыялістам, але нельга вырабіць нешта добрае, калі не будзе першапачатковага высакаякаснага прадукту. Таму сувязям з СВК — асаблівая ўвага. І не проста ўвага. Напрыклад, сёлета мы набылі ў лізінг для сельскагаспадарчых кааператываў нашага раёна 14 новых халадзільных ёмістасцяў па захоўванні малака. Вядома, гэтыя ёмістасці — сучасныя, з нержавейкі, а не алюмініевыя, што сталі ў СВК раней. Адпаведна, гэта якасць той жа сыравіны, якая ў рэшце рэшт прыйдзе да нас на прадпрыемства, а значыць — і якасць нашага сыру.



Да слоў Аляксандра Міхайлавіча варта дадаць: гаспадаркам аказваецца дапамога і ў набыцці пэўных рэактываў, прыбораў кантролю якасці малака; заводскія спецыялісты, сумесна з ветэрынарнай службай раёна, са спецыялістамі раённага сельгасупраўлення пастаянна наведваюць гаспадаркі, абмяркоўваючы падчас такіх наведванняў тыя ці іншыя праблемныя пытанні.

Гэткія надзвычай цесныя партнёрскія адносіны завода з гаспадаркамі не перашкаджаюць, аднак, прад'яўляць апошнім самыя жорсткія патрабаванні па якасці малака. Цяпер, як вядома, асаблівая ўвага звяртаецца на ўтрыманне ў ім антыбіётыкаў, якія трапляюць потым і ў выпрацаваную з яго прадукцыю. На прадпрыемстве ўстаноўлены, па сутнасці, двайны кантроль у гэтым кірунку: тэсты на антыбіётыкі праводзяцца як у сыравіннай лабараторыі (прымяняецца хуткі так званы экспрэс-метад), так і ў лабараторыі імунаферментага аналізу (а ўжо тут робіцца больш глыбокае даследаванне). Між іншым, на пытанне, ці «дастае» дзятлаўскіх малакаперапрацоўшчыкаў расійскі санітарны кантроль, менавіта які і засяродзіў увагу на антыбіётыках, на дзятлаўскім прадпрыемстве адказалі так: «Нам ад нашых расійскіх партнёраў хаваць няма чаго: вытворчасць чыстая, прадукцыя натуральная, мы нават харчовыя фарбавальнікі (прычым натуральныя), якія нам рэкамендуе навука, прымяняем толькі ў выключных выпадках...»



Аднак паслухаем дырэктара дзятлаўскага прадпрыемства Аляксандра Дубовіка яшчэ, які, нагадаем, падчас гутаркі асаблівую ўвагу звяртаў на прыбытак.

***— Аляксандр Міхайлавіч, дык што ж, адным прыбыткам і мераецца ўсё на заводзе?***

— Ну вядома ж не, і, увогуле, так ставіць пытанне ні ў якім разе нельга. Для чаго патрэбен прыбытак? Для людзей. Менавіта ўсё вакол чалавека круціцца, менавіта чалавек — у цэнтры ўсяго, у цэнтры ўсёй дзейнасці. На заводзе апошнім часам створаны добрыя ўмовы працы. Возьмем, напрыклад, пакоі адпачынку, у якіх ёсць і электрачайнікі, і мікрахвалевыя печы, і халадзільнікі... А галоўнае, у калектыве добры мікраклімат, які і той жа добрай працы спрыяе.

* * *

Сёлета працаўнікі Дзятлаўскага сыраробнага завода адзначылі 65-годдзе з дня яго стварэння. Гэта напачатку было зусім невялікае прадпрыемства, на якім працавалі ўсяго 7 чалавек. Цяпер на ім працуюць каля 240 чалавек; як зазначана ўжо, тут выпускаюць 10 тон сыроў за суткі, прычым мяркуюць выйсці і на большыя аб'ёмы. Праўда, як таксама зазначаюць на заводзе, трохі стрымлівае зона, або сыравінныя магчымасці сельскагаспадарчай зоны раёна... Дзятлаўскі сыраробны завод — неаднаразовы пераможца розных харчовых выставак і конкурсаў, пастаянны ўдзельнік абласной выстаўкі «Еўрарэгіён» і іншых выставак.

У 2007 годзе на заводзе зарэгістраваны гандлёвы знак «Сырная краіна». І на самай справе, гэта — сапраўдная сырная краіна. Прычым, як падкрэсліваюць у аддзеле забеспячэння і збыту прадпрыемства, усё, што выраблена тут, — абавязкова прадаецца. І, напэўна, самае галоўнае: працаўнікі гэтай сырнай краіны не спыняюцца і не збіраюцца спыняцца ў сваім руху наперад, у сваім развіцці, пры гэтым тут пастаянна маюць добры запас ідэй.

**Іван БАРАНОЎСКІ.**

УНП 500055917.

**НА ЗДЫМКАХ:**

**1. Дружная каманда аддзела забеспячэння і збыту: менеджар Алена КУІС, начальнік аддзела Людміла ЛЯВОНАВА, эканамісты Ірына ПАНКЕВІЧ і Ірына ІВАНОЎСКАЯ.**

**2. Майстар Ганна ВЯНСКО сочыць за працэсам паспявання сыру.**

**3. Лабарантка-мікрабіёлаг Вольга КОНАН праводзіць імунаферментны аналіз малака.**

**4. Тэхнолаг прадпрыемства Алена ЯКІМЧЫК і начальнік вытворчай лабараторыі Марына НАВІЦКАЯ.**

**5. Новая вытворчасць па канцэнтраванні сыроваткі. На здымку аператар Алена АНДУРА.**

**6. Сырароб Вольга КАЛОДКА, па сутнасці, толькі кантралюе працэс прыгатавання сыру.**

**7. На ўчастку ўпакоўкі сыру: Наталля ГАРОХ, Тамара ХАЛОПІК, Таццяна ЁРШ, Ірына ГОЛУБ.**

**8. Лабарантка сыравіннай лабараторыі Ірына ЁРШ.**

**9. У 2008 годзе на заводзе ўведзена камп'ютарызаваная аўтаматычная лінія па прыгатаванні сыру.**

**10. На ўчастку пастэрызацыі і сепарыравання сыроваткі — аператар Алена ЕДЧЫК.**

**11. Шмат малака прадпрыемства забірае сваімі малакавозамі. На здымку: пасля разгрузкі малакавозы старанна мыюцца.**

**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**

**Працаўнікі Дзятлаўскага сыраробнага завода віншуюць усіх сваіх калег, партнёраў, спажыўцоў з Калядамі і надыходзячым Новым годам і шчыра зычаць усім выдатнага здароўя, дабрабыту, новых здзяйсненняў, ажыццяўлення ў новым годзе самых патаемных жаданняў і задум. Невычэрпнага АПТЫМІЗМУ ўсім вам!**

ЗВЯЗДА 22 снежня 2010 г.



# УСТАНОВА, ЗАПАТРАБАВАНАЯ ЧАСАМ

## На кожнага выпускніка Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны — 3-4 запыты ад гаспадарак

### НАРАСХВАТ

Да размеркавання ў Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны яшчэ некалькі месяцаў, але нават сёння амаль усіх выпускнікоў гэтага навучальнага года гатовыя разабраць гаспадаркі краіны. Нам паказваюць цэлы стос заявак, якія ўжо маюцца на маладых спецыялістаў, на некаторых па 2—3. Калі хлопцы і дзяўчаты праходзяць практыку на 4 і 5 курсах, іх нагледжваюць гаспадаркі, і лістоў сюды ідзе вельмі шмат. Цяжка ўявіць, што будзе вясною.

— За тыдзень да размеркавання тэлефоны ў акадэміі «кіпяць», хоць з кабінета выходзь. Усе хочуць забраць нашых выпускнікоў, часам і слёзныя просьбы бываюць, — дзеліцца **рэктар Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны, доктар ветэрынарных навук, прафесар Антон Іванавіч ЯТУСЕВІЧ**.



Рэктар Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны Антон ЯТУСЕВІЧ.

Падчас гутаркі з Антонам Іванавічам, які свае рэктарскія абавязкі сумяшчае з працай на пасадзе намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі, мы высвятляем, што такі ажыятаж вакол выпускнікоў аграрнай установы звязаны не толькі з тым, што Віцебская ветакадэмія рыхтуе спецыялістаў на высокім ўзроўні.

— Попыт на падобных спецыялістаў заўсёды вялікі быў, ёсць і будзе. І рыхтуем мы спецыялістаў дастаткова. Не толькі наша ВНУ, я кажу за ўсю аграрную адукацыю. Даязджаюць амаль усе спецыялісты, думаю, што не менш 99 працэнтаў. На сённяшні дзень праблема — іх замацоўванне. Пасля двух гадоў працы толькі 33—40 працэнтаў застаюцца на месцах, куды трапілі па размеркаванні. Што тычыцца нашых студэнтаў, на размеркаванні на аднаго выпускніка, як правіла, да 4 працоўных месцаў. Прапаноўваюцца і добрыя ўмовы, калі маладым спецыялістам выдзяляюць кватэры, катэджы, заробкі абяцаюць добрыя. Але, напрыклад, летась у Гомельскай вобласці, у Брагінскім раёне прапаноўвалася месца ветэрынарнага ўрача з акладам 280 тысяч. Можаце сабе ўявіць? Нават стыпендыя на той час была ненамнога меншая. А маладому чалавеку трэба ж не толькі есці і плаціць за жыллё, але і абуцца, апрануцца, бацькам дапамагчы, а калі ён вырашыць сваю сям'ю завесці, тады што? У моцных гаспадарках маладыя спецыялісты прыжываюцца, пытанне стаіць аб тых слабых гаспадарках, дзе не толькі сацкультбыт, але і аплата працы слабая. Як правіла, там людзі не затрымліваюцца.

***— А на ваш погляд, як можна такую праблему вырашаць, каб спецыялісты заставаліся ўсюды?***

— Я б хацеў заўважыць, што акцэнт зараз робіцца на аграрыяў. Але ж не хапае на вёсках настаўнікаў, медыкаў. Вось фельчары ў вяскова-акушэрскіх пунктах яшчэ ёсць усюды, а ўрачоў — адзінкі. Некалі быў такі тэзіс: зраўняць умовы пражывання ў горадзе і ў вёсцы, яго трэба актыўна прасоўваць у жыццё. І гэта за кошт аграгарадкоў прасоўваецца. Калі будзе належнае жыллё, будуць дзейнічаць добры медыцынскі пункт, школа для дзяцей, клуб, каб маладыя людзі на дыскатэку маглі схадзіць, ды і заробкі належныя, адтуль моладзь не будзе бегчы. Лічу, праблема толькі ў гэтым.

***— Як бы вы ахарактарызавалі беларускія гаспадаркі, яны змяніліся за апошнія пяць гадоў?***

— Я дзіўлюся той істэрыі, якая вядзецца вакол Беларусі Расіяй. У мяне брат жыве ў Арлоўскай вобласці. Летась праехаў Смаленскую, Бранскую і палову Арлоўскай вобласці, — ніводнага кароўніка, які б эксплуатаваўся, не бачыў, вокны і дзверы выдраныя, шыферу няма на даху. Ніводнага статка не бачыў і ніводнага трактара на полі. Гэта жнівень месяц! І паўсюль бур'ян. А вы праедзьцеся па Беларусі. Нашы гаспадаркі на вачах памяняліся. Я Беларусь аб'ездзіў: і ў савецкі час з аднаго канца ў другі, і цяпер часта бываю. Ці маглі б мы раней думаць, што на фермах будуць робаты, якія дояць кароў, а чалавек нават не будзе дакранацца. Карова стаіць у станку, рухаецца па коле, апарат пад вымя падыходзіць, масажуе, мые, доіць. Чалавек сядзіць за камп'ютарам і назірае за працэсам пры дапамозе відэакамеры. Некалі такое я бачыў у Германіі, зараз усё гэта ў нас. За пяцігодку 500-660 фермаў рэканструяваныя альбо пабудаваныя нанава, створаны новыя птушкафабрыкі. Лічу, што курс на буйнамаштабную вытворчасць у сельскагаспадарчай прадукцыі апраўданы, добра, што да моцных далучаюць слабыя гаспадаркі. Апошнім канкурэнцыю не вытрымаць. Толькі буйныя, моцныя гаспадаркі могуць дазволіць сабе закупляць новае абсталяванне, прэпараты, будаваць новыя фермы. Няправільна некаторыя думаюць, што фермеры нас накормяць, гэта немагчыма. Я часта сустракаюся з народам, і нярэдка чую нешта накшталт, што сельская гаспадарка — гэта балота, куды ўсё «дуецца». Але я не пагаджаюся з такім меркаваннем. Аддача ёсць — за пяць гадоў вытворчасць малака павялічылася ў пяць разоў, мяса — амаль у два разы. У савецкі час, калі на карову надойвалі тры тысячы літраў малака, давалі за гэта ордэны, медалі. Зараз па рэспубліцы мы выходзім на 4 тысячы, а вазьміце перадавыя гаспадаркі як Сноў, Белавежскі, там на 7—10 тысяч выходзяць. У крамах прылаўкі ломяцца ад прадуктаў, а памятаеце, што было за савецкім часам? Сельскую гаспадарку трэба падымаць, дапамагаць, адсюль і мы будзем жыць лепей.



Загадчык кафедры анатоміі жывёл дацэнт Аляксей МАЦЫНОВІЧ са студэнтамі ў музеі акадэміі.



Лабараторна-практычныя заняткі па паразіталогіі са студэнтамі 5 курса вядзе выкладчык Юрый СЛЯПЦОЎ.

### НОВЫЯ ПАДЫХОДЫ

***— Напэўна, і патрабаванні да спецыялістаў зараз выраслі?***

— Безумоўна, прамысловая жывёлагадоўля гэта ў пэўным сэнсе машына, для кіравання якой патрэбны глыбокія веды. Так пад Віцебскам адным з буйнейшых сельгаспрадпрыемстваў, калгасам «Альгоўскае», кіруе наш выпускнік Цімур Надзірашвілі. Ён кажа, што ў гаспадарцы валодаюць дастатковымі ведамі, каб выходзіць на ўзровень па надоях у 3—4 тысячы ў год. І каб дабівацца такіх вынікаў, дапамога не патрэбна. Калі ж перад аграрыямі будзе стаяць задача ў 7—8 тысяч, тут без актыўнай дапамогі вучоных не абысціся, бо трэба вывучаць розныя «тонкасці»: які стан здароўя жывёлы, якія вітаміны і іншыя рэчывы неабходныя, каб выйсці на высокі ўзровень прадукцыйнасці.

Мы гаспадаркам прапануем метадычныя распрацоўкі, рэкамендацыі па нарыхтоўцы і параапрацоўцы кармоў, па правільным кармленні жывёлы, па прафілактыцы хвароб. Нездарма кажуць, што ўрач лечыць чалавека, а ветэрынар — чалавецтва. 193 хваробы агульныя ў чалавека і жывёл. Хваробы могуць перадавацца не толькі пры непасрэдным кантакце з жывёлай, але і праз няякасныя прадукты. За апошнія гады з'явіўся цэлы тузін новых хвароб. Але ў нас захавалася на належным узроўні ветэрынарная навука і практыка.

За многія дзясяткі гадоў на тэрыторыі рэспублікі не было ніводнага выпадку вострых інфекцыйных хвароб! Для прыкладу: у Англіі ад «каровінага шаленства» захварэла і было знішчана 3 мільёны кароў, ад яшчура ў Ангіі спалена каля 5 мільёнаў авечак, у паўднёва-усходняй Азіі ад птушынага грыпу — 140 мільёнаў бройлераў. Гэта страты на мільярды долараў. Мы нават пазбеглі курыных і птушыных грыпаў, на слыху быў свіны грып, зараз кажуць пра казіны — у Галандыі 80 тысяч коз захварэла і было знішчана, успышка была лакалізавана, і хвароба не распаўсюдзілася.

Мы не стаім убаку ад такіх праблем. У нас пры акадэміі ёсць навукова-даследчыцкі інстытут, 24 навуковыя лабараторыі пры кафедрах, якія стаяць на вастрыі праблемы, і як толькі з'яўляецца хвароба, ставіцца задача высветліць этыялогію і знайсці сродкі абароны. У 2008-м мы адкрылі такую спецыяльнасць як ветэрынарна-санітарная экспертыза прадукцыі жывёлагадоўлі, штогод набіраем 50 чалавек. Яна звязана перш за ўсё з патрэбамі часу: пастаянна ўзнікаюць то малочныя, то мясныя войны. Выпускнікі будуць займацца кантролем на мясаперапрацоўчых прадпрыемствах, на малаказаводах. Трэці год вядзём падрыхтоўку спецыялістаў-фармацэўтаў, перш за ўсё рыхтуем іх для Віцебскай біяфабрыкі. Дарэчы, нідзе, акрамя нас, на постсавецкай прасторы ветэрынарных фармацэўтаў не рыхтуюць.

Вы ведаеце, што абарот на пакупку сродкаў абароны жывёл штогод у Беларусі звыш 200 мільярдаў рублёў? Столькі сродкаў ідзе на закупку прэпаратаў з розных крыніц. Пяць гадоў таму айчынных прэпаратаў у нас было толькі 23 працэнты. Грошы з краіны на закупку прэпаратаў ішлі ў Германію, Польшчу, Францыю, Славенію, Расію і іншыя краіны (а гэта нашы абаротныя сродкі, заробкі, гэта працоўныя месцы).

За апошнія 5 гадоў у краіне па вытворчасці такіх прэпаратаў выйшлі на 65-70 працэнтаў. І беларускія прэпараты ў 2—3 разы таннейшыя, чым тыя, што ідуць з Галандыі, Францыі.

Віцебская акадэмія за пяць гадоў перадала 133 камплекты навукова-тэхнічнай дакументацыі на вытворчасць прэпаратаў.

### ПРАКТЫКА

Антон Іванавіч упэўнены, што немагчыма добрага спецыяліста падрыхтаваць без натуральнай практыкі, нельга яе падмяняць адпрацоўкамі пэўных аперацый на муляжах. У адпаведнасці з навучальным планам і адукацыйным стандартам практычная падрыхтоўка студэнтаў акадэміі займае каля 50 працэнтаў вучэбнага часу.

Для клінічнай падрыхтоўкі студэнтаў у акадэміі маецца вучэбная гаспадарка і на кожнай кафедры, дзе фарміруюцца спецыялісты, свае клінікі — акушэрская, тэрапеўтычная, хірургічная і інш. З бліжэйшых гаспадарак сюды прывозяць хворых жывёл, і студэнты адпрацоўваюць усе неабходныя навыкі, лечаць іх. На выпускных курсах уведзены экзамен па практычных навыках і ўменнях.

Заключаны дагаворы на сумесную практычную дзейнасць з буйнымі жывёлагадоўчымі комплексамі, птушкафабрыкамі і таварнымі гаспадаркамі прамысловага тыпу. Безумоўна, ветакадэмія аказвае на іх жыццядзейнасць пэўны ўплыў — дапамагае рэкамендацыямі, якія тычацца ўтрымання жывёл, дыягностыкі хвароб. Асабліва шчыльна акадэмія супрацоўнічае з гаспадаркамі Віцебскай вобласці, працоўныя групы з ліку выкладчыкаў замацаваныя за пэўнымі раёнамі.

Маецца тут лабараторыя інфармацыйных тэхналогій, ёсць і сваё тэлебачанне. Так, калі ідзе складаная аперацыя і на ёй не можа прысутнічаць вялікая група студэнтаў, то хлопцы і дзяўчаты назіраюць за ёй, седзячы ў аўдыторыі: на экране высвечваюцца ўсе маніпуляцыі.

Сёння цяжка знайсці гаспадарку, у якой бы не працавалі выпускнікі Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны. Сярод найбольш вядомых выпускнікоў — старшыня Мазырскага райвыканкама Уладзімір Дворнік; Герой сацпрацы, які на Міншчыне ўзначальваў племзавод «Чырвоная зорка» Іосіф Плаўскі, былы міністр сельскай гаспадаркі Леанід Русак і шмат іншых.

У савецкі час ветакадэмія забяспечвала спецыялістамі гаспадаркі Малдовы, Казахстана і паўночнай часткі Расіі.




Дзень акадэміі — замежныя студэнты таксама святкуюць Дзень акадэміі.

### СПЕЦЫЯЛІСТЫ ВЕТАКАДЭМІІ ПРАЦУЮЦЬ ПА ЎСІМ СВЕЦЕ

І зараз выпускнікі гэтай ВНУ працуюць ва ўсіх кутках свету. Калі нашы спецыялісты трапляюць за мяжу, яны там высока цэняцца, бо вызначаюцца не толькі добрымі ведамі, але і працалюбствам. Напрыклад, у той жа Германіі фермеры аддаюць перавагу нашым, а не сваім спецыялістам, бо ў беларусаў і фінансавыя запыты меншыя, і старання больш. Выхаванцы Віцебскай ветакадэміі працуюць у ЗША і Канадзе, у Іспаніі і Італіі, Польшчы і Расіі.

Сюды па навуку прыязджае шмат моладзі з іншых краін. Сёння тут навучаюцца студэнты з многіх краін свету: Расіі, Украіны, Літвы, Латвіі, Ірана, Лівана. Апошнім часам стала паступаць шмат моладзі з Туркменістана. Для тых замежнікаў, што маюць праблемы з мовай і якім трэба падцягнуць веды па профільных прадметах, працуе падрыхтоўчае аддзяленне. Сёння на ім займаецца 30 студэнтаў (28 — туркмены, адзін самаліец і адзін грамадзянін Лівана).

У замежных студэнтаў, як і ў беларускіх, найбольшай папулярнасцю карыстаецца спецыяльнасць «ветэрынарная санітарыя і экспертыза». Ну і, безумоўна, многія замежнікі, якія сюды едуць, хочуць паступаць на ветэрынарыю.

**Ірына ВІНАРСКАЯ — метадыст факультэта падрыхтоўкі да ВНУ**, якая адказвае за замежных студэнтаў, расказвае, што многія выпускнікі ўжо з-за мяжы падтрымліваюць сувязі са сваімі сябрамі па акадэміі, з выкладчыкамі, перапісваюцца ў інтэрнэце.

Сёлета сярод беларусаў самы высокі конкурс на дзённую форму навучання быў па спецыяльнасці «ветэрынарная санітарыя і экспертыза» (2,6 чалавека на месца, прахадны бал 229) і ветэрынарная фармацыя (2,2 і 214 адпаведна). Паступаюць сюды хлопцы і дзяўчаты з усіх куткоў Беларусі — як вяскоўцы, так і гараджане.



Выкладчык дысцыпліны «Арганізацыя ветэрынарнай справы» Аляксандр ПРУДНІКАЎ вядзе заняткі са студэнтамі 4 курса факультэта ветэрынарнай медыцыны.

Выпускнікі профільных сярэдніх навучальных устаноў маюць магчымасць вучыцца па скарочаных тэрмінах на аснове інтэграцыі вучэбных планаў ВНУ і каледжаў.

Мы заспелі ўступную кампанію, якая праводзіцца ў Віцебскай ветакадэміі ў лістападзе-снежні — вёўся прыём на завочнае аддзяленне, ішлі экзамены. Сярод абітурыентаў была і Вольга Міхальцова, якая ўжо 6 гадоў працуе свінаводам на РС ПУП СГЦ «Зарэчча»: «Мне вельмі падабаецца мая праца, я працую на апаросах. Мне падабаюцца жывёлы, прыемна даглядаць іх, дарыць ім нараджэнне. Я скончыла каледж і адразу вырашыла паступаць у акадэмію, каб стыць дыпламаваным спецыялістам».



Дацэнт кафедры паразіталогіі Максім СІНЯКОЎ прымае залік у студэнткі 5 курса Вольгі ВІНАГРАДАВАЙ.

### ДАВЕДКА

**Установа адукацыі «Віцебская ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны» — прызнаны цэнтр вышэйшай адукацыі і навукі краіны. У 2009 годзе Прэзідэнт узнагародзіў ВНУ Ганаровым сцягам Рэспублікі Беларусь — гэта вышэйшая ўзнагарода для ўстаноў, прынятая ў нашай краіне. Акадэміі прысвоены статус вядучай навучальнай установы аграрнага кірунку.**

**У яе складзе 5 факультэтаў, 28 кафедраў, аграрны каледж, філіялы ў гарадах Рэчыца і Пінск, навукова-даследчы інстытут прыкладной ветэрынарнай медыцыны і біятэхналогіі, Рэспубліканская лабараторыя інфармацыйных тэхналогій.**

**Сёння ў акадэміі працуе 178 кандыдат, 24 дактары навук.**

**Трэба сказаць, што гэта адна са старэйшых (створана ў 1924 годзе) навучальных устаноў Беларусі, якая на дзённай і завочнай формах навучання рыхтуе ветэрынарных і зоаінжынерных спецыялістаў, а з 2008 года пачалася падрыхтоўка ветэрынарных фармацэўтаў і ветэрынарна-санітарных урачоў вышэйшай кваліфікацыі. За гады існавання акадэміяй падрыхтавана звыш 30 тысяч урачоў ветэрынарнай медыцыны і 10 тысяч зоаінжынераў.**

### МІНІ-ГАРАДОК

Уладанні Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны размяшчаюцца на тэрыторыі ў 17 гектараў. Гэта як міні-гарадок, у якім ёсць усё, пачынаючы ад вучэбных карпусоў і заканчваючы інтэрнатам (амаль усе студэнты забяспечваюцца жыллём) і домам культуры, у якім створаны танцавальны і эстрадны ансамблі, духавы аркестр, вакальныя групы. У спартыўных залах працуюць секцыі па 18 відах спорту. У сталоўцы можна смачна пад'есці за невялікую суму (першае, другое, трэцяе каштуюць 3-4 тысячы). Усё побач, 5-7 хвілін — і студэнт з інтэрната можа трапіць на заняткі. Здаецца, быццам гэты вучоны гарадок адасоблены ад знешняга свету, тут няма ніводнага будынка, які б не належаў акадэміі. А калі вы патрапіце ў гэтыя ўтульныя дворыкі, можа здацца на нейкае імгненне, што вы трапілі ў мінулае — прыгожы галоўны корпус — пабудова 1912 года (будынак зямельнага банка Віцебскай губерні).

У яшчэ адным старым будынку знаходзіцца анатамічны музей. **Аляксей МАЦЫНОВІЧ, які загадвае кафедрай анатоміі,** правёў для нас экскурсію:

— Гэта даўняя сусветная традыцыя — мець музеі пры кафедрах анатоміі і ветэрынарных і медыцынскіх ВНУ. У нашым музеі больш за тысячу экспанатаў. Самым буйным экспанатам з'яўляецца шкілет індыйскага слана — гэта былая артыстка мінскага цырка. Яна пражыла свае 46 гадоў, пасля здарылася няшчасце, сланіха зламала косці, выступаючы на арэне цырка. Самым старым экспанатам нашага музея з'яўляецца чучала каня, якое зроблена ў 1820 годзе. Па тых звестках, якія захаваліся, гэты конь належаў князю Івану Вітгельнштэйну, які падчас вайны з французамі разам з гэтым канём адстойваў подступы да Санкт-Пецярбурга. У нас ёсць шмат чучал і хатніх, і дзікіх жывёл, у тым ліку і экзатычных (тыгра, ільва, гімалайскага мядзведзя). Ёсць паўлін (пава), сярод беларускіх звяроў — наш асілак зубр, лось, бабёр. Музей выкарыстоўваецца як для занятак, так і для навукова-даследчай дзейнасці студэнтаў. А яшчэ гэта папулярнае месца ў экскурсійным плане. Заходзяць сюды як госці горада, так і школьнікі, якім яшчэ выбіраць сабе прафесію. І цалкам магчыма, што некаторыя з іх праз некаторы час стануць студэнтамі Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ,**
**Аляксей СУПРУН,**
**Алена ДАЎЖАНОК.**

УНП 300002681.



Метадыст факультэта давузаўскай падрыхтоўкі Ірына ВІНАРСКАЯ курыруе ўсіх замежных студэнтаў.




У аграрных ВНУ поўным ходам ідзе прыёмная кампанія на завочную форму навучання. Адказны сакратар прыёмнай камісіі акадэміі Павел ГУРСКІ (на здымку справа) абмяркоўвае з абітурыентамі-завочнікамі нюансы здачы іспытаў.



Новы корпус.



Ля раскладу заняткаў.



Начальнік аддзела кадраў Радміла КУРЫЛЕНКА дэманструе, колькі запытаў на выпускнікоў наступнага года ўжо прыйшло ў акадэмію.